

АДХОДЫ: ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ЦІ ЗАХОЎВАЦЬ? 7

ЛАНДШАФТНЫ ДЫЗАЙНЕР ПРА БЕЛАРУСКІЯ ПАРКІ 12





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЖНІЎНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 161 (29028)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАРАНІК, міністр аховы здароўя:**

*«Прэзідэнт паставіў задачу да 2025 года падвоіць зарплаты для медыцынскіх работнікаў. Цяпер мяняюцца механізмы аплаты працы. Мы мяняем інструменты. Аклад павышаецца істотна, але стымулюючых і кампенсавальных надбавак робіцца ўсяго толькі 13. Гэта той інструмент, які дазволіць у далейшым дастаткова хутка і ўсім павышаць заработную плату. На 2020 год плануецца павышэнне ў 20 %. На сённяшні дзень быў маленькі аклад і 44 надбаўкі стымулюючага, кампенсавальнага характару, якія ўстанаўліваліся альбо галоўнымі ўрачамі, альбо прадстаўнікамі на месцах. Заўсёды тут быў нейкі элемент суб'ектывізму».*

# КАВУН — ЯГАДА БЕЛАРУСКАЯ



Фота БелТА.

Удзельнік кавуновага фестывалю Арцём ШАМЕЛА.

**Нават у тых, хто ў гэтым сумняваўся, калі пашчасціла трапіць у мінулую суботу ў Лоеў, усе сумненні, напэўна, развеяліся. У горадзе праходзіў «Дзень Кавуна і яго сяброў» — свята, якое абяцае стаць традыцыяй на поўдні Беларусі. Бо кавуны і дыні ўжо надзейна прапісаліся там, як і вінаград, — усю гэтую «экзотыку», сабраную ў мясцовых садах і агародах, з апетытам дэгуставалі госці кавуновага фестывалю.**

## КОРАТКА

- **Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў ліпені склала Br1128,5.**
- Турысты з 59 краін наведалі Брэст дзякуючы бязвізаваму рэжыму з пачатку гэтага года.




- **Фрунзенскі раён Мінска ў I паўгоддзі 2019 года стаў лідарам па колькасці праведзеных здзелак куплі-продажу кватэр — 5 849 (21 % ад усіх учыненых).**
- Банкі сталі выяўляць больш падробленых еўра і беларускіх рублёў.


ISSN 1990 - 763X

19161


## Нерухомасць

# КВАТАРАНТЫ ВУЧЫЦЦА ПРЫЕХАЛІ...

### Падчас студэнцкага ажыятажу здымнае жыллё даражэе не толькі ў сталіцы, але і ў абласных цэнтрах

**Для іншагародніх студэнтаў першая цяжкасць пры паступленні ў інстытут зусім не сесія, а пошук кватэры. Гэта калі не далі інтэрнат, а такое здараецца нярэдка.**

**Наваспечаныя студэнты сталічных ВНУ пачынаюць уплываць на рынак арэнды жылля. Сярэдні ўзровень цэн у ліпені і жніўні ўжо адрэагаваў на сезонны ажыятаж. Традыцыйны рост попыту на арэнду кватэр у Мінску напярэдадні новага навучальнага года назіраецца трэці месяц запар. У параўнанні з першым месяцам лета колькасць запытаў па пошуку здымнага жылля павялічылася амаль на трэць, і гэтая тэндэнцыя мае ўсе шанцы на працяг.**


СТАР. 4




## Бліжэй да людзей

# Ніша не застанецца пустой

### «Белпошта» і «Беларусбанк» запусцілі сумесны праект для жыхароў сельскай мясцовасці

**Колькасць сельскага насельніцтва ў Беларусі няспынна змяншаецца. Такое звужэнне кола патэнцыйных кліентаў прыводзіць да таго, што адпаведна скарачаецца колькасць банкаўскіх аддзяленняў. Канешне, аплата пры дапамозе мабільнага і інтэрнэт-банкінгу год ад году набірае абароты, але наколькі лёгка людзям у паважным узросце асвоіць новыя тэхналогіі? І яны, вядома ж, ідуць плаціць на пошту. А што рабіць у выпадку, калі пошта не можа выканаць пэўную аперацыю — напрыклад, папоўніць уклад або выдаць крэдыт?**

Таму ААТ "АСБ Беларусбанк" разам з РУП «Белпошта» запусцілі сумесны праект па прадстаўленні банкаўскіх паслуг сельскаму насельніцтву.

— Ён рэалізоўваўся паэтапна ва ўсіх абласцях, — кажа **намеснік старшыні праўлення ААТ «АСБ Беларусбанк» Святлана КАЖЭКІНА.** — Мы прааналізавалі банкаўскія паслугі, якія былі запатрабаваны насельніцтвам. Гэта адкрыццё ўкладаў і аперацыі па іх, абслугоўванне бягучых рахункаў, папаўненне і зняцце наяўных з картачных рахункаў, афармленне картак і пакета дакументаў на атрыманне крэдыту. У нашым праекце задзейнічана 997 аддзяленняў паштовай сувязі па ўсёй краіне. Напрыклад, за восем месяцаў работы адкрыта каля 900 укладных рахункаў на суму каля 3 мільёнаў 500 тысяч рублёў. Прыблізна паўтара мільёна кліентаў скарысталася магчымасцю папаўнення рахункаў, афармлення картак і зняцця з іх грошай, а таксама прагляду балансу. Ад мая было пададзена пяць заявак на крэдыты. Адна з іх адобрана, чатыры яшчэ знаходзяцца ў стане разгляду. Рэалізацыя гэтага праекта пашырае геаграфію прысутнасці і магчымасці банкаўскай сферы па прадстаўленні паслуг. Мы зыходзім з таго, што ўсе нашы жыхары павінны мець магчымасць скарыстацца тымі паслугамі, якія дае наш банк.

Існуе прыказка, што часам новае — гэта добра забытае старое. Так адбылося і гэтым разам. Праўда, часткова.


СТАР. 3

# ПЕРАЗДАЧА ДЛЯ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ

## У Беларусі будуць удасканальваць схему паступлення ў ВНУ

**Аб такой неабходнасці заявіў Прэзідэнт, прымаючы з дакладам міністра адукацыі Ігара КАРПЕНКУ. Асноўнымі тэмамі традыцыйнай сустрэчы напярэдадні Дня ведаў сталі праблемы ў школах і недахопы ўступнай кампаніі. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, скаргаў адносна апошняга хапае: «Да гэтага часу крытыка на цэнтралізаванае тэсціраванне. Крытыкуюць новую методыку, якую вы вынайшлі, па падліку гэтых балаў. Але галоўнае — не балы, а веды. Усе павінны разумець, і бацькі ў тым ліку: калі ў дзіцяці ёсць веды, то па якіх балах і шкалах ты іх ні лічы, яно ўсё роўна паступіць у ВНУ. Калі ведаў няма, ніякія балы не дапамогуць».**

Больш за ўсё, як адзначыў лідар краіны, яго хвалюе, што абітурыенты не здаюць экзамены твар у твар з экзаменатарам. «Я адчуваю, што гэта вялікі наш недахоп. У нас нешта недапрацавана, — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт упэўнены, што такая размова сам-насам з выкладчыкам дапамагае дакладней ацаніць магчымасці абітурыента. «Я шчыра шмат разоў казаў: калі б мне давялося так здаваць тэсціраванне, як цяпер, то наўрад ці быў бы я мяне, мякка кажучы, вынік лепшы, чым размаўляючы з выкладчыкам», — падзяліўся сваёй думкай беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што яму складана прымаць рашэнне ў гэтай сферы, каб не памыліцца. «Да гэтага трэба ўважліва аднесціся, таму што паступаюць найлепшыя дзеці з найлепшых сем'яў. У пераважнай большасці. Я не баюся гэта сказаць — тыя, дзе бацькі хваляваліся 11 гадоў, каб дзіця паступіла ў ВНУ. Яны ўсялякім чынам падтрымлівалі яго, — канстатаваў кіраўнік краіны. — Таму мы можам пры паступленні ў ВНУ пакрыўдзіць гэтую значную частку сямей, якія нясуць асноўную нагрузку ў грамадстве, з'яўляюцца вельмі ўплывовымі людзьмі і вызначаюць атмасферу нашага грамадства і цяпер, і ў будучыні».

Пры гэтым ён падкрэсліў, што не прымае пакуль ніякіх рашэнняў з-за недахопу інфармацыі. Да пытанняў сістэмы адукацыі плануюць вярнуцца пазней на спецыяльнай нарадзе, дзе разгледзяць сітуацыю ў школах, ВНУ: падрыхтоўку падручнікаў, фінансаванне, арганізацыю сістэмы адукацыі першаснага і вышэйшага звяна. «Увогуле, усе пытанні мы павінны на ўзроўні Прэзідэнта разгледзець на нарадзе, і пажадана, калі неабходна, прыняць рашэнне аж да цэнтралізаванага тэсціравання», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён паведаміў, што размову арганізуюць не з падачы Мінадукацыі — большая частка ўдзельнікаў будзе прадстаўляць не гэта ведамства, каб была дыскусія і альтэрнатыва.

«Магчыма, лепш яе правесці пасля парламенцкіх выбараў, каб нас зноў не абвінавацілі, што пад парламенцкія выбары мы праводзім гэту вельмі важную нараду, якая вызначыць твар нашага грамадства ў будучым», — канстатаваў лідар краіны.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз звярнуў увагу, што работнікам сістэмы адукацыі трэба плаціць належныя зарobкі. Настаўнікі з'яўляюцца цэнтральнымі постацямі, на якія разлічвае грамадства. «Без настаўніка мы нішто ўвогуле, таму што няма на каго абаперціся ў гэты рыначны час, акрамя настаўніка. Асабліва ў сёлах, вёсках, малых гарадах», — выказаў меркаванне Прэзідэнт.

Лідар краіны нагадаў, што асноўныя веды вучні павінны атрымліваць на ўроках, а дома толькі адшліфоўваць атрыманыя ўменні: «Не трэба, каб яны пяць ці шэсць гадзін працавалі ў школе і столькі ж дома. Гэта ненармальна. Мы калечым дзяцей».

У першы вучэбны дзень кіраўнік краіны збіраецца наведаць адну са школ, каб яшчэ раз азнаёміцца з праблемамі сістэмы. Міністр адукацыі, карыстаючыся магчымасцю, запрасіў Прэзідэнта на адкрыццё 93-й школы ў мікрараёне Уручча. Па словах Ігара Карпенкі, ужо 99,7 % школ падпісалі пашпарты гатоўнасці.

Асаблівая ўвага Прэзідэнта ў першыя школьныя дні — роўныя ўмовы для ўсіх школьнікаў.

«Самае галоўнае маё патрабаванне ў гэтыя дні (першыя дні школы) — дзеці павінны быць аднолькавыя. Што я маю на ўвазе: яны павінны быць добра адзеты. Я не кажу, што аднолькава, але добра адзеты.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў апошнія дні перад школьнай парой трэба дапамагчы тым, хто знаходзіцца ў цяжкім становішчы і не можа ўдзяліць увагу падрыхтоўцы сваіх дзяцей.

На кантролі Прэзідэнта спрадвечныя праблемы сістэмы адукацыі — рамонт устаноў, забяспечанасць настаўнікамі, перапоўненыя школы ў некаторых раёнах (дарэчы, сёлета ў эксплуатацыю ўвядуць восем новых школ).

«Я ведаю, што і дзіцячых садкоў не хапае дзесьці. Дзякуй богу, што іх не хапае. Мы іх таксама дзясяткамі ўводзім і будзем уводзіць. Нам патрэбныя дзеці, таму мы павінны забяспечыць іх утрыманне», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны папярэдзіў, што сустрэча з міністрам адукацыі і сказанае падчас яе можа быць выстаўлена пэўнымі прадстаўнікамі грамадства як мерапрыемства перадвыбарчай кампаніі. «Я ў парламент не збіраюся выбірацца, таму ніякай перадвыбарчай кампаніі асабіста ў Прэзідэнта няма і быць не можа. А тое, што ў краіне парламенцкія выбары, дык я як кіраўнік дзяржавы (я няме абавязкі ніхто яшчэ не здымаў) абавязаны займацца гэтымі палітычнымі рэчамі. Прынамсі, каардынаваць гэтую работу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

### КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

**Пра асноўныя акцэнты свайго даклада Прэзідэнту пасля сустрэчы расказаў міністр адукацыі Ігар Карпенка.**

Нараду, якую анансаваў Аляксандр Лукашэнка, неабходна правесці да канца гэтага года. На яе запросяць навукоўцаў, прадстаўнікоў педагагічнай грамадскасці. «Я думаю, што Міністэрства адукацыі сканцэнтруе пералік тых пытанняў, пра якія казаў кіраўнік дзяржавы, даложыць сваё бачанне, разуменне, як гэта павінна дзейнічаць і працаваць. І мы павінны расставіць там усе кропкі над «і», — сказаў міністр.

Неабходна ўдасканальваць выніковую атэстацыю ў сістэме школьнай адукацыі. У гэтай сувязі разглядаюць у ведамстве і магчымасць увядзення нацыянальнага экзамену — сумяшчэння здачы некаторых школьных прадметаў з уступнымі экзаменамі.

Абмяркоўваць будуць на нарадзе і катэгорыю вучняў, якіх трэба прымаць у 10-я класы школ.

«Той, хто хоча пайсці ў профільны клас, павінен паказаць больш значны вынік. Але мы не выключаем і таго, што частка дзяцей будзе займацца на базавым узроўні. Для такіх дзяцей у нас арганізавана прафесійная падрыхтоўка з прысваеннем кваліфікацыі і выдачай пасведчання. Сёлета ўжо 11-ы клас будзе працаваць па гэтай схеме», — падкрэсліў Ігар Карпенка.

Для школ распрацаваны і пералік рэчаў, забароненых для праносу ва ўстанову, але, па словах міністра, гэта не значыць, што са школы робяць рэжымны аб'ект. «Разам з тым школа павінна з законнымі прадстаўнікамі, вучнёўскім самакіраваннем, заснавальнікамі ўстановы адукацыі, мясцовымі органамі на месцах вызначыць парадак функцыянавання», — сказаў міністр адукацыі.

У якасці прыкладу ён прывёў рашэнне з выкарыстаннем гаджэтаў на ўроках. У тыпавых планах унутранага распарадку вучэбных устаноў вызначана, што на ўроках без дазволу настаўніка імі карыстацца нельга.

Сугучча

# Іерогліфы для Караткевіча

**Гістарычны дэтэктыў Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» плануецца перакласці на кітайскую мову. Гэты маштабны міждзяржаўны праект, прымеркаваны да 90-гадовага юбілею беларускага класіка, беларуская дэлегацыя абмяркоўвала з кітайскімі выдаўцамі ў межах 26-й Пекінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі.**

Як адзначыў **кіраўнік дэлегацыі, намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ**, супрацоўніцтва нашых краін у галіне кнігавыдання доўжыцца не адзін год і мае канкрэтныя вынікі. Так, у Мінску ў перакладзе на беларускую і рускую мовы выдадзеныя ўжо больш за 30 кітайскіх аўтараў, ад класікаў Лі Бо, Ван Вэя, Ду Фу да сучасных літаратараў паэта Ван Гочжэня і славіста Ван Цзянчжаа. Пры фінансавай падтрымцы кітайскага боку ў Беларусі выйшлі тэматычныя нумары часопісаў «Нёман», «Маладосць», «Бярозка» і «Вясёлка». У Кітаі, у сваю чаргу, сёлета ўбачылі свет «беларускі» нумар аўтарытэтнага часопіса «Захад» і адмысловае выданне «10 выдатных людзей Беларусі» (яно ўключае, у прыватнасці, літаратурныя біяграфіі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і балетмайстра Валянціна Елізар'ева, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры Святланы Алексіевіч і першадрукара Францыска Скарыны) а ў хуткім часе выйдзе з друку кніга Сі Цзіньпіна пра дзяржаўнае кіраванне — на беларускай мове.

Наступным крокам мусіць стаць пераклад і распаўсюджванне на тэрыторыі Кітайскай народнай рэспублікі твораў беларускіх аўтараў. У якасці пілотнага праекта абраная кніга Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». І хоць адзін толькі высакаякасны прафесійны пераклад твора на кітайскую мову, паводле ацэнак спецыялістаў, абыдзецца ў 15—17 тысяч долараў, але гэтую работу абодва бакі лічаць важнай і перспектыўнай. Сярод іншых праектаў, якія выклікалі цікавасць у кітайскіх выдаўцоў, — пераклад беларускіх народных казак і кніг для дзяцей і падлеткаў, сумесны выпуск вучэбнай літаратуры, дапаможнікаў і мультымедыйных дадаткаў да яе.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

# ДЗІРКІ Ў СЫРЫ — ПРЫБЫТАК У ЭКСПАРЦЕ

## Ці дасць беларускі ракфор фору французскаму?



Фота БелТА.

**Асноўны рухавік экспарту ў сегменце малочнай прадукцыі сёлета — сыры. Пра гэта паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксей БАГДАНАЎ падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.**

У першым паўгоддзі аграрная галіна Беларусі ў экспартным кірунку спрацавала з плюсам. Па словах Аляксея Багданава, продаж сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання за мяжу склаў з пачатку года 101,6 працэнта, ці 2 557 мільёнаў долараў. Беларусь гандлявала з 88 краінамі — дарэчы, пяць дадаліся летась.

Начальнік упраўлення падкрэсліў, што ў міністэрстве ўвесь час працуюць над дыверсіфікацыяй і пашырэннем геаграфіі экспарту. Сёлета аграрыі здолелі асвоіць дванаццаць новых рынкаў, у тым ліку Афганістана, Пакістана, Тайланда, Кеніі, Лівіі, Маўрытаніі, Албаніі, Босніі і Герцагавіны, Аргенціны.

«Стратэгія апошніх гадоў — максімальна скараціць вытворчасць сыравінных тавараў кшталту сухога малака і павялічыць аб'ёмы вырабу гатовай прадукцыі, якая непасрэдна трапляе на паліцу крамы. Пакупнік бачыць, што сыр, ёгурт, смятана, масла — беларускія. Ствараецца пазнавальнасць брэнда, выхоўваецца лаяльнасць да нашага тавару», — растлумачыў Аляксей Багданаў. Ён адзначыў і рост на 8,4 % экспарту гатовых мясных вырабаў.

Аднак у адным з найбуйнейшых сегментаў экспарту — мясным — адзначаецца спад. У першую чаргу гэта тлумачыцца абмежаваннямі на пастаўку мяса на кострцы ў Расію. Таму таварныя групы пераразмеркаваныя, для кампенсацыі аграрыі адкрываюць новыя рынкі. Напрыклад, ужо да канца года айчынная ялавічына можа быць пастаўлена ў Турцыю.

### Зроблена ў Беларусі, прададзена ў СНД

Пастаўкі ў Расію крыху скараціліся, але па-ранейшаму ўсходняя суседка купляе 80 працэнтаў прадуктаў харчавання, выробленых беларускімі аграрыямі. У міністэрстве палітыка наступная: калі пастаўкі па адной пазіцыі скарачаюцца, па іншай — аб'ёмы нарошчваюцца. Такім чынам, аб'ём экспарту свініны ў Расію ўзрос у тры разы ў параўнанні з мінулым годам, павялічыўся продаж мяса птушкі, а малочнай прадукцыі амаль дасягнуў мільярда долараў — у асноўным за кошт масла. Добра купляюць у Расіі нашу бульбу, ільновалакно, жэлацін, рапсавы алей.

А ялавічыну на костцы, пастаўкі якой у Расію абмежаваныя, накіравалі ў іншыя краіны СНД і прадалі ў два разы больш, чым летась. Экспарт мясапрадуктаў у Садружнасць склаў 147 працэнтаў ад узроўню аналагічнага паказчыка мінулага года. Павялічыліся і пастаўкі гатовых мясных вырабаў нароўні з малочнай прадукцыяй.

Экспарт беларускіх сыроў вырас на 29 працэнтаў ад леташняга ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. «У гэтым сегменце ёсць пэўны поспех. Рэч у тым, што сыры — тавар, які не так проста прадаць. Бо ў кожнай краіне ёсць свае смакавыя перавагі. Сыроў больш за трыста відаў. А на рынку Расіі, СНД у нас склаліся аднолькавыя смакавыя перавагі, яшчэ з часоў Савецкага Саюза. Мы іх ведаем, умеем з імі працаваць, і дынаміка сведчыць аб правільнасці абранай стратэгіі», — падкрэсліў Аляксей Багданаў.

### У Кітай — па чыгунцы і морам

Найбольш цікавым і перспектыўным для экспарту сельскагаспадарчай і харчовай прадукцыі начальнік упраўлення назваў рынак Кітая. З канца мінулага года ў Паднябесную адпраўлена восем поўнакантэйнерных цягнікоў з малочнай прадукцыяй. Прапрацоўваецца пытанне арганізацыі паставак ялавічыны і мяса птушкі па маршруце «шаўковага шляху». На гэты момант экспартныя пастаўкі мяса ў Кітай ужо ўзраслі ў 38 разоў. Павялічыліся таксама пастаўкі шакаладу і іншых харчовых прадуктаў, звязаных з шакаладам, вод.

Аляксей Багданаў паведаміў, што для паставак у Кітай выкарыстоўваюцца два лагістычныя шляхі: марскі і чыгуначны. У цягнік уваходзіць 41 кантэйнер — 1 025 тон прадукцыі.

На рынках дальняга замежжа сёлета больш за ўсё павялічыўся экспарт беларускага мяса — у чатыры разы. Узраслі пастаўкі сыру, бульбы, агародніны, грыбоў, ільновалакна. Экспарт у краіны Еўрапейскага Саюза вырас на 22 працэнты. На першым месцы па аб'ёме паставак з Беларусі — Літва, у лідарах таксама Польшча і Германія.

Варвара МАРОЗАВА.

Надвор'е

# Цёплая Карына

## Нават першага верасня на поўдні краіны плюс 30

**Сонечнае і сухое надвор'е чакаецца ў нашай краіне на гэтым тыдні, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Камфортнае летняе надвор'е прынёс нам цёплы антыцыклон «Карына». А таму тэмпературны фон на 2—5 градусаў перавышае кліматычную норму для апошніх дзён жніўня. Не зменіцца сітуацыя ў атмасферы і вялікую частку гэтага тыдня. Наогул цяпер цыклоны далёка ад нас, так што яшчэ доўгі час будзе суха і цёпла.

Сёння чакаецца невялікая воблачнасць, без ападкаў. Вецер прагназуецца слабы, пераменных напрамкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 23 да плюс 29 градусаў. У сераду таксама невялікая воблачнасць, па-ранейшаму будзе без ападкаў. Вецер прагназуецца ўсходні, ад слабага да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 градусаў па паўночным усходзе да 16 цэпла па паўднёвым захадзе краіны. Удзень будзе плюс 20—27 градусаў, па паўднёвым захадзе нашага рэгіёна — 28—30 цяпла.



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

Пераменная воблачнасць чакаецца ў чацвер, 29 жніўня. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 да плюс 12 градусаў, па захадзе краіны — да плюс 16 градусаў. Удзень будзе 20—27 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны — да плюс 29 градусаў.

У апошнія дні лета атмасферны ціск пачне паніжацца і ўплыў антыцыклону зменшыцца. Па папярэдніх прагнозах айчынных сіноптыкаў, у пятніцу і на выхадныя воблачнасць узмацніцца. Месцамі, пераважна па заходняй частцы краіны, магчымыя кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны. А вось уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—15 цяпла, у заходніх раёнах — да плюс 17 градусаў. Дастаткова цёпла будзе і ўдзень, калі чакаецца ад 20—22 цяпла па паўночным усходзе да плюс 28—30 градусаў па паўднёвым захадзе краіны. Лета працягваецца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У лясах па-ранейшаму горача...

**У Беларусі працягваецца пажаранебяспечны сезон. За мінулы тыдзень службовыя асобы дзяржаўнай лясной аховы ліквідавалі 16 узгаранняў у лясным фондзе, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Найбольшая колькасць узгаранняў адбылася на поўдні краіны: лясы ў Брэсцкай вобласці гарэлі шэсць разоў, у Мінскай — чатыры, у Гомельскай і Гродзенскай — па тры разы. У Віцебскай і Магілёўскай абласцях выпадкаў узгарання ў лясным фондзе зафіксавана не было. Усе агачі былі аператыўна патушаныя.

У Мінлясгасе адзначылі, што ўсяго з пачатку года ў лясным фондзе адбылося 565 лясных пажараў. У пажаранебяспечны сезон дзяржаўная лясная ахова — больш за 13 тысяч чалавек — пераведзена на ўзмоцнены варыянт нясення службы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Каб помнілі...

# Пайшоў з жыцця літаратуразнавец і пісьменнік Пятро Васючэнка

**25 жніўня не стала Пятра Васючэнкі — вядомага беларускага паэта і празаіка, драматурга, літаратуразнаўца, загадчыка кафедры беларускай мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Яму было ўсяго 60 гадоў.**



Можна сказаць банальна: заўчасна памёр руплівы даследчык мовы і літаратуры, крытык і педагог. Але насамрэч у сучаснай літаратуры стала менш на аднаго вельмі добрага казачніка, які ўмеў спалучаць неспалучальнае, прывіваў любоў да роднай мовы на нейкім падсвядомым узроўні і быў для вельмі многіх вучняў і калег прыкладам развважлівасці, чуласці і спакою.

«Нас яднаў наш Полацк, наша былая вуліца Фрунзэ, якая цяпер носіць імя Ефрасінні Полацкай, мова, родная літаратура і шчырыя чалавечыя адносіны, — згадаў у сваім «Фэйсбуку» пісьменнік, радыё- і тэлевядучы Навум Гальпяровіч. — Яго мама працавала бібліятэкарам у першым тэхнікуме і вельмі ганарылася разумным і таленавітым сынам. Мы неяк разам ездзілі па Ушаччыне і заязджалі на лецішча Сяргея Панізніка, дзе ён нас частаваў учарашняй «поліўкай з піндзюкамі», што стала нашым міфам, як прыдуманае ім «таварыства з'едзенага цмока» — вынік нашай вандроўкі на возера Нешчарда на Расоншчыне... Ён чытаў мае творы і нават пісаў пра іх, а я запрашаў яго на радыё і тэлебачанне. Пасля страты Алеся Пісьмянкова гэта яшчэ адна невыносна сумная страта... Светлая памяць!»

Адны ведалі Пятра Васілевіча як таленавітага літаратара, аўтара экалагічных казак і «тату» фэнтэзійных камічных персанажаў паноў Кубліцкага ды Заблоцкага, другія — як мудрага настаўніка, глыбокага даследчыка, які не толькі сам апантана і захапляльна развважаў пра беларускую літаратуру, але і заахвочваў іншых рабіць гэта. Пастаноўкі на яго п'есы не пакідалі раўнадушнымі гледачоў сталічных і абласных тэатраў Беларусі, а апавяданні, казачныя аповесці і вершы Пятра Васючэнкі («Белы мурашнік», «Жылі-былі паны Кубліцкі і Заблоцкі», «Прыгоды аднаго губашлёпа», «Каляровая затока», «Піраміда Лінея» і іншыя кнігі) шматлікія маленькія і дарослыя чытачы ацанілі як у арыгінале, так і ў перакладах на польскую, рускую, славацкую, чэшскую, балгарскую, нямецкую і англійскую мовы.

**Рэдакцыя «Звязды» выказвае спачуванні родным і блізкім Пятра Васючэнкі.**

# Ніша не застанецца пустой

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі аперацыі з укладамі ажыццяўляліся ў паштова-тэлеграфных і ашчадных дзяржаўных касах, — зазначае **намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Алена БАРКОЎСКАЯ.** — Таму для пошты гэта не зусім новая паслуга. Цяпер, калі банкі зніжаюць сваю фізічную прысутнасць у сельскай мясцовасці і пераходзяць на дыстанцыйную форму абслугоўвання, да нас паступаюць прапановы аказваць некаторыя віды іх паслуг на сяле. Трэба адзначыць, што мы не ставім сваёй мэтай поўнасцю замяніць банк на вёсцы. Пошта валодае ўнікальнай інфраструктурай, якая ахоплівае ўсю тэрыторыю краіны. Гэта дазваляе наблізіць сацыяльна значныя паслугі да кожнага спажыўца. Напрыклад, акрамя звыклых тавараў праз пошту можна заказаць нават будаўнічыя матэрыялы — у ведамства заключаны дагавор з Беларускай цэментнай кампаніяй. Адбылося гэта не так даўно — у красавіку. Але за гэты час на адрас нашых філіялаў ужо адгружана 500 тон цэменту. Мы адкрыты для супрацоўніцтва і з іншымі арганізацыямі.

Акрамя таго, у нашай пошты ёсць добры прыклад сумеснага праекту з РУП «Белфармацыя», які рэалізуецца ў Мядзельскім і Маладзечанскім раёнах. Сутнасць яго ў тым, што некаторыя лекі і тавары медыцынскага прызначэння можа прынесці звычайны паштальён. Ужо зроблены 53 такія пастаўкі.

Разам з тым спыняцца на дасягнутым «Белпошта» і «Беларусбанк» не плануюць.

— У перспектыве мы разлічваем на пашырэнне супрацоўніцтва, што датычыцца прадстаўлення фінансавых паслуг, — працягвае Святлана Кажэкіна. — У верасні з'явіцца магчымасць пагашаць крэдытныя прадукты Беларусбанка праз сістэму АРІП, у тым ліку і ў аддзяленнях паштовай сувязі. Гэтага доўга чакалі жыхары як вёсак, так і гарадоў. Акрамя таго, сёння ў банку распрацаваны крэдыт для набыцця насельніцтвам тавараў беларускіх вытворцаў. Стаўка па ім будзе вылічацца як стаўка рэфінансавання плюс тры працэнтныя пункты. Мы лічым, што ён будзе запатрабаваны.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# НАРКАГАНДЛЯРА ПАДВЁЎ ЛАНЦУГ

**Аператыўнікі Цэнтральнага РУУС Мінска затрымалі 24-гадовага непрацуючага жыхара сталіцы, датычнага да незаконнага абароту наркотыкаў.**

Наведаць маладога чалавека, адносна якога мелася інфармацыя пра распаўсюджванне ім наркотыкаў, праваахоўнікі вырашылі з самай раніцы. Аднак заспець па месцы жыхарства наркагандляра не ўдалося: на званок у дзверы ніхто не адказваў. Пабачыцца з хлопцам хацелі не толькі міліцыянеры, але і адзін з кліентаў: 23-гадовы раней судзімы малады чалавек чакаў, як высветлілі аператыўнікі, партыю наркотыка, дзяжурачы пад акном прадаўца.

Падчас гутаркі са спажыўцом увагу праваахоўнікаў прыцягнуў хлопец, які ехаў міма на ровары. Убачыўшы аператыўнікаў, той дадаў хуткасці. Але не разлічыў магчымасці двухколавага транспарту: у таго зляцеў ланцуг, і малады чалавек зваліўся з ровара проста пад ногі міліцыянерам. Высветлілася, што гэта і быў той самы гандляр наркотыкамі. Пры вобыску ў яго было выяўлена каля аднаго грама гашышу, у кватэры — яшчэ каля 4,5 грама. Наркотык быў прыхаваны ў ліхтарыку ў аддзяленні для батарэек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэзідэнт Францыі адзначыў, што «капіталізм звар'яцеў»



Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон заявіў, што «дэмакратыя выйшла з моды, а капіталізм выйшаў з-пад кантролю і звар'яцеў». Палітык лічыць, што неабходна стварыць больш дасканалую сістэму. «Мы самі ж спараджаем тыя праявы няроўнасці, урэгуляваць якія затым не ў стане», — сказаў Макрон падчас сустрэчы з бізнесменамі, дадаўшы, што гаворка павінна ісці аб перабудове сусветнай сістэмы. Французскі лідар не першы раз вылучае канцэпцыі па крызіс сусветнай эканомікі. У гутарцы з бізнесменамі ён заўважыў, што капіталізм «дэградуе». Яшчэ быўшы міністрам эканомікі Францыі, Макрон казаў, што з'яўляецца прыхільнікам «канвергенцыі». Гэтая ідэя злучэння вартасцяў капіталізму і сацыялізму вылучалася ў 1970-я гады савецкім акадэмікам і праваабаронцам Андрэем Сахаравым.

## Іран накіраваў эсмінец у Адэнскі заліў

Ваенна-марскія сілы Ірана накіравалі ў Адэнскі заліў эсмінец «Саханд», паведаміў агенцтву IRNA кіраўнік штаба іранскай арміі контр-адмірал Хабібула Саяры. Паводле яго слоў, эсмінец будзе забяспечваць бяспеку плавання іранскіх суднаў у міжнародных водах гэтага рэгіёна. «Саханд» будуць суправаджаць дапаможны карабель і верталётаносец, адзначыў контр-адмірал. Іран нярэдка адпраўляе караблі ў гэты рэгіён для забеспячэння бяспекі і барацьбы з пірацтвам, аднак гэтым разам сітуацыя іншая з прычыны напружанасці, якая ўзнікла вакол бяспекі суднаходства, а таксама на фоне заяў ЗША аб намеры затрымаць танкер з нафтай Adrian Darya (былы Grace 1), які раней пакінуў Гібралтар.



## Папа Рымскі заклікаў маліцца за Амазонію

Папа Рымскі Францыск у нядзельным звароце да вернікаў заклікаў маліцца за найхутчэйшае спыненне лясных пажараў у Амазоніі. Яны распаўсюджваюцца на працягу ўжо больш чым трох тыдняў: «Гэтыя «лясныя лёгкія» жыццёва важныя для планеты», — адзначыў пантыфік. Шэсць з дзевяці штатаў бразільскай Амазоніі просяць дапамогі вайскоўцаў. Прэзідэнт краіны санкцыянаваў удзел арміі ў барацьбе са стыхіяй. У Генеральным штабе далажылі, што ў рэгіёне размешчаны 44 тысячы салдат і афіцэраў, гатовых дапамагчы пажарным, а падмацаванне можна перакінуць з іншых частак краіны. Ваенна-паветраныя сілы ўжо выдзелілі самалёты — для тушэння з паветра і для дэсантавання пажарных атрадаў. Тэхнічную дапамогу прапаноўваюць і іншыя краіны. Аднак некаторым з іх самім патрэбна дапамога: лясныя пажары бушуюць і ў суседняй Балівіі. Там ужо згарэла 800 тысяч гектараў. Па маштабах цяперашнія пажары ў сельве — найбуйнейшыя прынамсі за пяць гадоў. З прычыны вялізнага значэння Амазоніі для планеты стыхійнае бедства выклікала заклапочанасць ва ўсім свеце. Экалагі называюць прычынай пажараў палітыку бразільскага прэзідэнта Балсанару. Ён, у сваю чаргу, не выключае, што пажары — якраз правакацыя экаактывістаў.

# КВАТАРАНТЫ ВУЧЫЦЦА ПРЫЕХАЛІ...



## Новых студэнтаў будзе менш, чым звычайна?

Паводле інфармацыі Міністэрства адукацыі, сёлета выпускнікоў з 11 класаў на 5 % менш, чым годам раней, што павінна адбіцца і на ліку першакурснікаў. Магчыма, менавіта з гэтай прычыны па выніках ліпеня попыт на арэнду кватэр адставаў ад леташняга ўзроўню, паведамляюць спецыялісты партала REALT.BY. Што мы маем цяпер?

Яркага дэфіцыту патрэбнага кватарантам жылля не назіраецца і актыўна «вымываюцца» толькі самыя бюджэтныя аб'екты. Колькасць свабодных кватэр за месяц нават трохі павялічылася. А вось дынаміка цэн на арэнду кватэр у Мінску аказалася станоўчай — падаражэлі ўсе тыпы кватэр.

**Калі б студэнты папярэдзілі суседзяў аб запланаванай гулянцы, то экстраннага высялення можна было б пазбегнуць.**

На канец месяца сярэднія цэны арэнды кватэр у галоўным мегаполісе прыплюсавалі ад 1,1 % да 3,8 %. Так, цалкам «спакаваныя» аднапакаёвыя кватэры прапануюцца ў сярэднім за 268 долараў, двухпакаёвыя — 350 долараў, а трохпакаёвыя кватэры — 433 долары ў месяц. Апошні раз цэны былі такімі высокімі ў сярэдзіне 2015 года.

Рост цэн на арэнду кватэр склаў за апошні год 9—11 %, у той час як самі кватэры падаражэлі толькі на 4 %. За кошт адрозненняў у тэмпах росту цэн сярэдняя даходнасць ад здачы кватэр дасягнула адзнакі ў 6,1 %, што з'яўляецца максімумам за апошнія чатыры з паловай года.

## Пошукі з «наваротамі»

Няхай дэфіцыт не зашкальвае, але кватэру студэнтам пашукаць давядзецца. Мы падрыхтавалі для іх некалькі парад.

Першае — спытаць у будучых аднагрупнікаў, ці не шукае хтосьці сабе суседа. Інфармацыйных варыянтаў дапамогі маса: тэматычныя рэсурсы і форумы, паблікі ў сацсетках, тэлеграм-каналы, дзе збіраюць свежыя прапановы з розных сайтаў і яшчэ шмат чаго.

Дарэчы, у некаторых універсітэтах вешаюць дошкі аб'яў, дзе жыхары навакольных дамоў размяшчаюць прапановы. Варта прыглядзецца: можа быць, і ў вас такая ёсць. Падчас ажыятажу з агенцтвамі звязвацца цяжка. Яны ж прапануюць адну кватэру на некалькі дзясяткаў чалавек, таму атрымліваецца гульня навыперадкі «хто першы дабег — той і зняў». А яшчэ інфармацыя пра кватэры часта не адпавядае рэчаіснасці. Кліентаў звычайна завабліваюць заніжанай цаной, а ў рэальнасці яна вышэйшая.

Упэўнена заяўляю, здымаць жыллё ў аддаленых раёнах сталіцы нават добра. Пачаткоўцам-іншагароднім так спачатку прасцей вывучыць горад. Да таго ж, пакоі і кватэры не ў цэнтры могуць каштаваць адчувальна танней. Акрамя таго, цэны на кватэры змяняюцца ў залежнасці ад сезона. Напрыклад, у канцы ліпеня і ў жніўні попыт на жыллё вырастае. Пік спадае дзесьці да канца лістапада. Да наступнага лета ўсё застывае на адным узроўні. Таму ці пажывіце пару месяцаў у кагосьці і шукай варыянт потым, ці задумайся над пошукам кватэры загадзя.

Не варта баяцца доўгай дарогі на вучобу і дадому. На самай справе ў студэнцтве даволі шмат вольнага часу, плюс у дарозе можна нешта вывучыць. Цяпер яшчэ можна знайсці пакоі за 200 рублёў у месяц (праўда, не ў самых зручных раёнах Мінска), але іх ужо мала.

## Як змагацца з прадузятасцю?

Большасць уладальнікаў кватэр першапачаткова з асцярогай ставяцца да студэнтаў і наогул да адзінокіх людзей. Усе хочуць бачыць сваімі арандатарамі маладую сямейную пару. А састатнім бескватэрным жыць дзе?

Як жа знайсці паразуменне з гаспадаром такога патрэбнага жылля? Тут галоўнае не знешні выгляд, а ўменне пераконваць. Калі ты малады і самотны, без вечарынак не абысціся: на вуліцы збірацца холадна, а ў кафэ — пакуль дорага. Варта сумленна прызнацца гаспадарову, што госці будуць. Але ты гарантуеш чысціню і парадак. Увогуле, прыйдзецца пагаварыць падаросламу. І паводзіць сябе гэтак жа. Не варта заводзіць кацікаў і сабачак цішком ад гаспадароў. Усё роўна заўважаць.

Такім чынам, ты знайшоў жыллё, якое выглядае прыстойна на фотаздымках і падыходзіць па цане. Далей трэба стэлефанавацца з гаспадарамі, каб паглядзець кватэру ўжывую. Калі пры знаёмстве арэндадаўца здаецца вам хоць бы крыху дзіўным — бяжыце. У будучыні гэтыя дзівацтвы могуць выявіцца ў дзвесце разоў мацнейшымі.

Бывае, класная кватэра засланяе вочы і зусім не ўнікаеш, які гаспадар чалавек, а гэта вельмі важна. Трэба адразу дамаўляцца пра распіскі і перавод грошай — лепш на картку, умовы магчымых рамонтаў-паляпшэнняў і гэтак далей. А то вось мой знаёмы зняў утульную кватэру, зрабіў там касметычны, але дарагі рамонт, а яго адразу папрасілі вызваліць памяшканне — у выніку ён прагарэў на досыць вялікую суму.

І яшчэ, калі на праглядзе падлашчваюцца і прама гатовыя «зніжачку зрабіць» — нешта нячыста. Чалавек, які здае кватэру, ведае, колькі каштуе яго кватэра, і не стане без прычыны апускаць цану. Гэта дакладна.

## Дагавор лепш заключыць

Аформіць «дружбу» з гаспадаром лепш на паперы. Гэта гарантыя і для цябе (што жыллё будзе пэўны перыяд і плаціць трэба фіксаваную суму), і для арэндадаўца (што ты не з'едзеш, будзеш прыносіць грошы, а да яго не завітае падатковая). Так спакайней усім. Але...

Афіцыйная рэгістрацыя паміж кватарантам і ўласнікам прадугледжвае, што гаспадар кватэры павінен плаціць падатак за свой прыбытак. Падатак залежыць ад колькасці пакояў у кватэры і ад месцазнаходжання дома. Напрыклад, штомесячны падатак за аднапакаёвую кватэру ў раёне першай эканоміка-планіровачнай зоны Мінска (найбліжэйшай да цэнтра) складзе 32,5 рубля. Другая зона прадугледжвае падатак 27 рублёў, трэцяя і чацвёртая — 23 рублі, а чацвёртая зона — 18,5 рубля. Гаспадары дамаўляюцца аб «кампенсацыі» гэтага падатку. Звычайна падатак дзеляць бакі з разліку 50 на 50, але абавязак выплаты падатку застаецца за ўласнікам.

У дагаворы трэба абавязкова зафіксаваць усе важныя моманты. Яны датычацца ўмоў вяртання закладу (калі ён ёсць), стану кватэры (мэблі, тэхнікі, рамонту) да твайго ўезду. Варта дамовіцца загадзя і пра тое, хто аплачвае камуналку. Калі гэта робіць гаспадар, прасі паказаць плацёжкі: былі выпадкі, калі яны штучна завышаліся. Ты аддаеш 40 рублёў, а рэальна арэндадаўцу патрэбныя толькі 30.

## Правярай усё без выключэння

У аб'яве пішуць, якая добрая кватэра, але на практыцы — ідэальных практычна не бывае. Лепш загадзя падрыхтаваць спіс рэчаў, якія абавязкова трэба праверыць. Першае, гэта вокны. Ці не дзьме там з усіх шчылін, ці адчыняюцца рамы. Лепш, каб стаялі шклопакеты.

Другі па значнасці пункт — сантэхніка, асабліва бачок у прыбіральні. Не саромейцеся націскаць на ўсё і круціць краны, бо гэтым трэба будзе карыстацца. Потым ідзе бытавая тэхніка. Яе трэба дасканала праверыць, у якім яна стане: калі нешта зламанае, удакладні, ці ў курсе гаспадар, што так ужо было. Гэта важна зафіксаваць, каб потым не расплачвацца за чужую шкоду. І яшчэ, асобна трэба праверыць уваходныя дзверы. Пераканацца, ці не захрасаюць ключы, ці ўсе замкі надзейныя і працуюць. Калі ў цябе ёсць нейкія асаблівыя патрабаванні (ёсць алергія на спецыфічныя пахі), лепш адразу спытаць, ці былі дагэтуль на кватэры кошкі або іншая жывёла.

## Змена становішча вітаецца

Не трэба думаць, што савецкая шафа ў пакоі прыкручана да падлогі. Яе можна і трэба перасоўваць. Калі хочаш прывезці сваю мэблю ці, наадварот, пазбавіцца ад часткі гаспадарскай — не саромейся пра гэта спытаць. Як правіла, уласнік будзе толькі за, бо хтосьці прывядзе іх жыллё ў парадак.

Зусім не абавязкова перафарбоўваць падлогу і сцены: тыя ж плямы на шпалерах можна замаскіраваць дэкаратыўнымі налепкамі або плакатамі. А працёрты ламінат або лінолеум выдатна маскіруецца недарагім дываном.

І апошняе. Студэнты, асабліва першакурснікі, павінны быць гатовыя з'ехаць у любы момант. Аднойчы сын маіх знаёмых адзначаў здадзеную сесію, ды так, што суседзі паскардзіліся гаспадарам. Апошнія прыехалі на наступны ж дзень і папрасілі яго хуценька з'ехаць, нягледзячы на заключаны дагавор. Потым яны дамовіліся на падаўжэнне тэрміну высялення на тыдзень, але кватэра была страчана. А калі б студэнты былі знаёмыя з суседзямі і папярэдзілі іх аб запланаванай гулянцы, то экстраннага высялення можна было б пазбегнуць.

Арэнда пакоя ратуе, калі не атрымалася знайсці суседзяў для кватэры. Але гэта яшчэ больш ненадзейны варыянт. Гаспадары не трымаюцца за цябе гэтак жа, як пры здыманні жылля цалкам, таму могуць папрасіць з'ехаць у самы нечаканы момант.

## На перыферыі недарагое жыллё ў Гомелі, а нятаннае — у Брэсце

За колькі можна зняць кватэру ў Віцебску? У горадзе рэальна нядорага арандаваць нерухомасць на працяглы тэрмін, але для гэтага прыйдзецца праглядзець мноства варыянтаў. Да таго ж прапановы без пасярэднікаў абыходзяцца танней. Для эканоміі можна скарыстацца прапановай па падсяленні. Такія варыянты стартуюць са 100 рублёў у месяц.

Каб зняць менавіта кватэру, прыйдзецца выдаткаваць больш. Цэны на аднапакаёвыя кватэры стартуюць са 170 рублёў у месяц. Па такой цане будзе жыллё не вельмі добрай якасці. Сярэдні цэннік аднапакаёвай кватэры ў гэтым абласным цэнтры знаходзіцца ў дыяпазоне 270—280 рублёў. Праўда, нават прасторныя кватэры часам здаюць танней (245 рублёў), калі мэбля прысутнічае толькі часткова (толькі кухня). Даражэй за ўсё здаюць двухпакаёвыя варыянты ў новабудоўлях — за 425 рублёў у месяц.

За 280 рублёў у месяц здымуць двухпакаёвую кватэру дзве дзяўчыны-студэнткі, якія вучацца ва ўніверсітэце горада Гродна. Дакладней, хочуць зняць. Бо тут нават двухпакаёвыя «хрушчоўкі» без рамонту здаюцца на працяглы тэрмін мінімум за 300 рублёў. Праўда, калі пастарацца, то можна знайсці аднапакаёвы бюджэтны варыянт у межах 230—250 рублёў. Трохпакаёвыя апартаменты ў студэнтаў карыстаюцца мінімальным попытам. А каштуе такая кватэра мінімум 400 рублёў.

На рынку другаснай нерухомасці ў Гомелі на старонках каталога прадстаўлена больш за 560 кватэр, даступных для арэнды. Сярэдні кошт невялікай аднапакаёвай кватэры — у межах 150—250 рублёў у месяц. За 300—340 рублёў можна знайсці аднапакаёвую кватэру з добрым рамонтам. Калі трэба арандаваць двухпакаёвую кватэру ў гэтым горадзе, бюджэт павышаецца да 250—300 рублёў у месяц за жыллё з простым рамонтам. Нерухомасць з сучасным інтэр'ерам і новай мэбляй здаецца па цане ад 350 рублёў і вышэй.

У Брэсце ёсць прапановы па здачы асобнага жылля або на падсяленне. Апошні варыянт бюджэтны, часцей за ўсё яго выбіраюць студэнты і працуючая моладзь. Зняць пакой у Брэсце каштуе ад 100 рублёў за месяц. Арандаваць аднапакаёвую кватэру (маласямейку) або пакой у прыватным сектары з асобным уваходам, але без выгод, атрымаецца прыкладна за 140 рублёў. Паўнавартасная аднапакаёвая жылплошча з «бабулінай» мэбляй абыдзецца даражэй — ад 130 долараў. Сярэдні цэннік невялікай, але дагледжанай кватэры складае ад 160 да 180 «зялёных». Двухпакаёвыя кватэры прапануюцца за 180—200 долараў. А самая высокая арэндная стаўка ў Брэсце на трохпакаёвую нерухомасць — 470—550 рублёў.

На спецыялізаваным сайце Брэста сабраны сотні аб'яў аб здачы кватэр на працяглы тэрмін, але танней чым за 150 умоўных адзінак кватэры студэнтам ніхто здаваць не хоча. Рынак арэнды нерухомасці напоўнены разнастайнымі прапановамі: можна танна зняць частку дома на ўскраіне або знайсці дарагія апартаменты ў цэнтры горада.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж» СООБЩАЕТ о проведении внеочередного общего собрания акционеров**

Собрание состоится 4 сентября 2019 года в 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А.

Повестка дня

1. О совершении сделок обществом.

Список акционеров для регистрации участников собрания составляется на 1 сентября 2019 года.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросу повестки дня собрания в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 28 августа 2019 года – по месту нахождения общества с 14.00 до 16.00.

Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.

Акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров – паспорт и доверенность.

Справки по телефону 8 0232 359 102.

**УНП 400052115.**

Утерянное свидетельство о государственной регистрации Торгового предприятия «РЭЙ-Сервис» (УНП 190599884) от 25.04.2014 года, считать недействительным.

Выданный представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ № 5715381 **считать действительным.**

**УНП 100122726.**

# МЕДАЛІ І АЛІМПІЙСКІЯ ЛІЦЭНЗІІ

**Беларускія спартсмены заваявалі 14 узнагарод на чэмпіянаце свету па веславанні на байдарках і каноэ ў венгерскім Сегедзе**



Наша зборная разам з камандай Германіі сталі найлепшай у агульнакамандным медальным заліку.

З гэтай нагоды Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне нацыянальнай камандзе па веславанні на байдарках і каноэ. *«Віншую з годнымі вынікамі на чэмпіянаце свету па веславанні на байдарках і каноэ ў Сегедзе, дзе вы заваявалі 14 медалёў, з якіх 6 залатых. Яшчэ раз пацвердзілі, што беларуская каманда — адзін з сусветных лідараў у гэтым відзе спорту. Такое стала магчымым дзякуючы высокаму прафесіяналізму і ўпартай працы спартсменаў, трэнераў і спецыялістаў»*, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што зладжаны калектыў нацыянальнай каманды падыдзе да Алімпіяды 2020 года ў аптымальным складзе і ў такой жа выдатнай форме. Ён таксама пажадаў спартсменам моцнага здароўя, дабрабыту і спартыўнага даўгалецця.

Двойчы на вышэйшую прыступку п'едэстала ўзнімаўся экіпаж жаночай байдаркі-двойкі Марына Літвінчук/Вольга Худзенка (200 м і 500 м) *(на фота)*. Таксама чэмпіёнамі планеты сталі Алена Наздрова (каноэ-адзіночка, 500 м), Вольга Клімава (каноэ-адзіночка, 5 000 м), Алег Юрэня (байдарка-адзіночка, 5 000 м) і экіпаж мужчынскай байдаркі-двойкі Станіслаў Дайнэка/Дзмітрый Натынчык (500 м).

Сярэбраныя ўзнагароды заваявалі: Мікіта Борыкаў (байдарка-адзіночка, 500 м), Арцём Козыр (каноэ-адзіночка, 200 м), Вольга Худзенка (байдарка-адзіночка, 500 м), экіпаж жаночай байдаркі-чацвёркі Марына Літвінчук, Вольга Худзенка, Надзея Папок, Маргарыта Махнева (500 м).

Уладальнікамі «бронзы» сталі: Марына Літвінчук (байдарка-адзіночка, 5 000 м), Алена Наздрова (каноэ-адзіночка, 200 м), жаночы экіпаж каноэ-двойкі Вольга Клімава/Надзея Макарчанка (500 м), мужчынскі экіпаж каноэ-чацвёркі Андрэй Багдановіч, Яўгеній Тэнгель, Максім Крысько, Віталь Асецкі (500 м).

# ІНДУСЫ, КІТАЙЦЫ, АЎСТРАЛІЙЦЫ...

## У Беларусь едзе сусветны бадмінтон

**З 29 жніўня да 1 верасня ў Мінску пройдзе міжнародны турнір «Belarus International — 2019». У спартыўна-забаўляльным комплексе «FALCON CLUB» на працягу чатырох дзён выступіць 160 спартсменаў з 35 краін свету. Мінскі турнір стане адным з кваліфікацыйных да Алімпійскіх гульняў 2020 года, на ім будзе разыграна пяць камплектаў медалёў — мужчынскія і жаночыя ў адзіночных гульнях, а таксама мужчынскія, жаночыя і змешаныя ў парах.**



Нагадаем, першы міжнародны турнір па бадмінтоне ў Беларусі прайшоў у 2018 годзе, ён быў тэставым спаборніцтвам да II Еўрапейскіх гульняў, праз год адбыліся самі Гульні, высокі арганізацыйны ўзровень гэтых турніраў уразіў як самых спартсменаў, так і міжнародных гасцей, таму Мінску даверылі яшчэ адзін буйны турнір. Калі на першых спаборніцтвах у Беларусі сабраліся спартсмены з 24 краін, то гэтым разам Belarus International налічвае ўжо прадстаўнікоў 35 краін. Гэта спартсмены з Ірана, Венгрыі, Германіі, Індыі, Аўстраліі, Швецыі, Кітая, Аўстрыі, Бельгіі, Канады, Англіі, Балгарыі, Беларусі, Малдовы, Чэхіі, Польшчы, Расіі, Шры Ланкі, Італіі, Амерыкі, Ізраіля, Фінляндыі, Швейцарыі, Нарвегіі, Эстоніі, Славеніі, Ісландыі, Украіны, Даніі, Турцыі, Нідэрландаў, Азербайджана, Латвіі, Літвы і Славакіі.

«Мы вельмі рады і ганарымся, што да нас едуць топ спартсмены, гэта вялікі вопыт. Такая колькасць удзельнікаў зарабляецца краінамі гадамі, — адзначае **старшы трэнер нацыянальнай каманды Беларусі па бадмінтоне Улада ЧАРНЯЎСКАЯ.** — Прыедзе вялікая дэлегацыя з Кітая, гэта адны з сусветных лідараў. Планавалася, што ў нас выступіць легенда сусветнага бадмінтона, неаднаразовы алімпійскі чэмпіён і чэмпіён свету Лінь Дань, але ў апошні момант па нейкіх акалічнасцях ён зняўся з турніру. Акрамя яго ў Мінску будзе шмат вядомых гульцоў — шмат азіятаў і топгульцы еўрапейскага бадмінтона», — адзначыла трэнер і дадала, што зараз узровень еўрапейскага бадмінтона значна вырас, таму казаць пра канкрэтныя краіны і спартсменаў, якія будуць прэтэндаваць на перамогу ў Мінску, складана. Абсалютна дакладна можна казаць, што барацьба будзе сур'ёзная, а для гледачоў асабліва цікавымі стануць супрацьстаянні еўрапейскіх гульцоў з азіятамі, бо гэта зусім розныя стылі гульні.

Беларусь на дамашніх спаборніцтвах прадставяць 13 спартсменаў — асноўная нацыянальная каманда і юніёры.

«Не ўсе юніёры змогуць згуляць у Мінску, таму што некаторыя ў гэтыя ж тэрміны з'язджаюць на першынство Еўропы для спартсменаў да 17 гадоў, якое будзе праходзіць у Польшчы. А наогул і для дарослых спартсменаў, і для маладых такі турнір — добры шанц паспрабаваць свае сілы з наймацнейшымі бадмінтаністамі свету. Нашым спартсменам трэба паказаць свой узровень, сваю гульню і набраць як мага больш ачкоў», — адзначае Улада Чарняўская.

Адзначым, што з мая 2019 да мая 2020 года спартсмены набіраюць рэйтынгавыя ачкі, каб трапіць на Алімпійскія гульні ў Токіа. З беларусаў найбольшы шанц адабрацца на турнір сёння ёсць у Алесі Зайцавай. «Для гэтага трэба гуляць вельмі шмат турніраў. Мы будзем прыкладаць усе намаганні для таго, каб пастарацца прабіцца. У перадалімпійскі год узровень турніраў вельмі вырас, таму што ўсе жадаюць трапіць у Токіа», — кажа настаўнік.



У параўнанні з першым міжнародным турнірам па бадмінтоне ў Мінску рэйтынг цяперашніх спаборніцтваў таксама вырас. Калі раней турнір у Беларусі лічыўся чэленджам, то цяпер ён інтэрнэшнл, гэта значыць, ачкі, якія ідуць у агульны залік ад удзелу ў ім, сталі большымі.

Улада Чарняўская адзначае, што арганізаваць такі турнір досыць складана, як правіла, падрыхтоўка да яго пачынаецца за год да старту. Адзін з самых важных момантаў — падбор суддзяў. Калі галоўную судзейскую брыгаду рэкамендуе Еўрапейская федэрацыя бадмінтона, то вось усе астатнія суддзі падбіраюцца краінай-арганізатарам. «Мы стараемся, каб гэта былі кваліфікаваныя спецыялісты, бо судзейства вельмі шмат значыць», — адзначае старшы трэнер.

Арэна «FALCON CLUB» ужо стала адной з самых любімых для беларускіх бадмінтаністаў, яна вельмі зручная як для спартсменаў, так і для суддзяў, і для гледачоў, таму што корты добра бачныя з усіх бакоў. «Пляцоўка кампактная і ў той жа час досыць вялікая. Добрае асвятленне», — адзначае Улада Анатольеўна.

Арганізатары спадзяюцца на цікавасць да турніру з боку беларускіх аматараў спорту. «На тэставым турніры ў 2018 годзе на трыбунах у асноўным былі людзі, якія займаюцца бадмінтонам на аматарскім і прафесійным узроўнях, а аматарскі бадмінтон у нас цяпер вельмі развіты, таму што ёсць добрыя арэны, увечары корты на іх ніколі не пустуюць, — тлумачыць старшы трэнер нацыянальнай каманды. — Еўрапейскія гульні ў Мінску далі яшчэ больш імпульс для развіцця гульні, спадзяёмся, што і цяпер гледачоў будзе шмат, тым больш што ўваход на турнір бясплатны. Усіх аматараў спорту запрашаем і чакаем!»

У чацвер, 29 жніўня, адбудуцца кваліфікацыйныя спаборніцтвы, 30 жніўня — 1/16 і 1/8 фіналу, раніцай 31 жніўня пройдуць 1/4 фіналу, увечары — паўфіналы, у сваю чаргу, 1 верасня адбудуцца ўсе пяць фінальных гульняў.

Навінкай міжнароднага турніру па бадмінтоне «Belarus International 2019» стане тое, што абсалютна ўсе матчы на чатырох кортах будуць трансліравацца ў прамым эфіры на Youtube і ў мабільнай праграме Badminton Europe. Нагадаем, што на леташнім турніры анлайн-трансляцыя вялася толькі з дзвюх гульнявых пляцовак. А анлайн-версія II Еўрапейскіх гульняў ішла толькі з цэнтральнага корта.



**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# Падзея, якая вярнулася да нас праз 20 гадоў

## Чэмпіянат свету па летнім біятлоне ў Раўбічах атрымаўся яркі і душэўны



**На гэтым свяце і спартыўным турніры адначасова на першых ролях аказаліся юніёры, яны заваявалі чатыры ўзнагароды. Двойчы на вышэйшую прыступку п'едэстала (у спрынце і пасьюце) узнімаўся Дзмітрый Лазоўскі. Яго партнёр па камандзе Мікіта Лабастаў прынёс у скарбонку зборнай залаты медаль у суперспрынце і «серабро» ў гонцы праследавання.**

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў юніёрскую зборную Беларусі і яе лідара Дзмітрыя Лазоўскага з годным выступленнем на чэмпіянаце свету. «На гэтым буйным міжнародным спартыўным форуме, які даверана правесці Раўбічам, вы выдатна прадставілі Радзіму, праявілі выдатнае майстэрства, волю, характар. Пераканаўча даказалі, што ў беларускім біятлоне расце дастойная маладая змена», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка пажадаў спартсменам захаваць набраны тэмп і імкненне быць найлепшымі, стаць годнымі прадаўжальнікамі слаўных традыцый, закладзеных папярэднікамі. «Мы верым у вас і чакаем новых перамог!» — падкрэсліў беларускі лідар.

«Я вельмі рады, што два «золаты» чэмпіянату свету ў юніёрскіх гонках мае, а трэцяе — Мікіты Лабастава. Атрымліваецца, усе залатыя медалі наша юніёрская каманда пакінула дома, — адзначыў Дзмітрый Лазоўскі пасля завяршэння апошняй гонкі чэмпіянату. — Я не лічу гэты старт прахадным, для мяне гэта паўнавартасны турнір, які, апроч перамог, выявіў некаторыя мае памылкі, над якімі трэба будзе папрацаваць у найбліжэйшы час», — адзначыў Дзмітрый і дадаў: у зімовым сезоне не выключана, што ён будзе выступаць ужо за дарослую зборную.

Дарэчы, асноўная каманда засталася без узнагарод дамашняга чэмпіянату. Нагадаем, у сусветным форуме прыняло ўдзел каля 250 спартсменаў (дарослыя і юніёры) з 26 краін.

**Генеральны сакратар Беларускай федэрацыі біятлона Дар'я ЛЕОШ** у завяршэнні турніру адзначыла: «Гэта быў цікавыя насычаныя дні, мы высока цэнім падтрымку Міжнароднага саюза біятланістаў, які давeрыў нам правядзенне такога значнага сусветнага першынства. Мы ўдзячныя кожнаму, хто прыклаў сілы да правядзення гэтых спаборніцтваў. Мы дзякуем шматлікім прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі за якаснае, маляўнічае асвятленне мерапрыемства, дзякуй, што паказваеце свету, якая прыгожая, адкрытая і гасцінная наша краіна. Мы дзякуем усім гледачам, якія прысутнічалі ў гэтыя дні на стадыёне, вы стварылі неверагодную атмасферу. Спадзяёмся, вы атрымлівалі асалоду ад знаходжання ў Беларусі і хутка мы сустрэнемся зноў».

Летні чэмпіянат свету для спартсменаў падвёў рысу пад падрыхтоўкай да зімовага сезона. Для арганізатараў чэмпіянат стаў праверкай усіх тэхнічных служба, бо ўжо ў 2022 годзе тут пройдзе этап Кубка свету.

*Мінск — Раўбічы — Мінск.*

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**«Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение ул. Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой»**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме № 35 по генплану в Минском районе без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика

**Информация о застройщике**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

**Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации**

В течение трех предшествующих лет ООО «СИ-трейдинг» как заказчиком строительства были построены следующие объекты, расположенные в д. Копище Минского района:

- жилой дом № 19/4 по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: июнь 2015 г. – март 2016 г.;
- жилой дом № 1 по ул. Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: сентябрь 2015 г. – июнь 2017 г.;
- жилой дом № 21Б по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: июнь 2017 г. – октябрь 2018 г.;
- жилой дом № 5 по Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: апрель 2018 г. – июнь 2019 г.

**Информация об объекте строительства**

**Цели строительства** – строительство жилого дома в составе объекта «Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение улицы Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой» в д. Копище Минского района.

**Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:**

начало строительства – май 2018 года;

окончание строительства – август 2020 года.

**Результаты государственной экспертизы проектной документации:**

положительное заключение государственной экспертизы от 23 марта 2018 г. № 241-70/18, выданное дочерним республиканским унитарным предприятием «Госстройэкспертиза по Минской области».

**Сведения о месте нахождения объекта строительства**

Местонахождение объекта строительства: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Боровлянский с/с, д. Копище; микрорайон № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района.

**Характеристика объекта строительства**

Проектной документацией предусматривается строительство жилого дома № 35 по генплану (далее – «жилой дом») в составе третьего пускового комплекса микрорайона № 1 Жилого района «Копище» по индивидуальному проекту.

В соответствие с определением, приведенном в Указе Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007г. № 667, здание жилого дома относится к домам типовых потребительских качеств.

Жилой дом – здание 148-квартирного жилого дома, 25-этажное, односекционное с подвалом и техническим «теплым» чердаком. На первом этаже размещены встроенные помещения административного назначения с отдельными входами. В уровне подвала размещен встроенно-пристроенный гараж-стоянка на 46 машино-мест. Жилой дом расположен вдоль ул. Подгорная. Заезд к жилому дому осуществляется с ул. Лопатина. После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с частичным использованием в качестве несущих элементов кладочного заполнения стен. Фундаменты свайные с монолитными железобетонными ленточными и столбчатыми ростверками. Наружные и внутренние стены техподполья – монолитные железобетонные. Колонны – монолитные железобетонные. Наружные и внутренние несущие стены жилой части из керамических поризованных блоков. Перегородки из пазогребневых полнотелых керамзитобетонных блоков. Перекрытия и покрытие – монолитные железобетонные плиты. Утепление наружных стен предусмотрено легкой штукатурной системой с минераловатными плитами. Лестницы – монолитные железобетонные марши и площадки. Кровля жилого дома – малоуклонная с покрытием из двух слоев кровельного материала. Кровля гаража-стоянки – эксплуатируемая под озеленение и автомобильные нагрузки с покрытием из тротуарных плит. Здание оборудовано тремя лифтами. Внутренняя отделка мест общего пользования предусмотрена с окраской стен, устройством плиточных полов и подвесных потолков.

В жилом доме предусмотрены поквартирные системы отопления с устройством индивидуальных узлов учета тепла. В качестве нагревательных приборов приняты радиаторы панельные. Вентиляция жилых помещений естественная. Вентиляция помещений кухонь, ванных и санузлов осуществляется через унифицированные вентблоки. Вентиляция гаража-стоянки – приточно-вытяжная с механическим побуждением. Здание оборудовано раздельными системами хозпитьевого и противопожарного водоснабжения. В здании предусмотрена система дымоудаления из внеквартирных коридоров, система подпора воздуха в шахты лифтов. В жилых комнатах предусмотрена установка автономных пожарных извещателей.

Электроснабжение осуществляется путем поквартирной разводки электропроводки. Учет потребляемой электроэнергии осуществляется электросчетчиками, установленными для каждой квартиры в этажных щитах. Предусмотрена автоматизированная система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ).

Для телефонизации жилого дома предусмотрено построение пассивной оптической системы (PON), обеспечивающей возможность подключения телефонных аппаратов, высокоскоростного интернета, цифрового телевидения. Для обеспечения содержания входной двери в подъезд закрытой на замок, двухсторонней связи с жильцами и дистанционной разблокировки из квартир входной двери используются видеодомофоны.

Технико-экономические показатели жилого дома: количество жилых этажей – 25; количество секций – 1; количество квартир – 148, в том числе: однокомнатных – 51 (общей площадью от 38,17 до 41,63 кв. м), двухкомнатных – 72 (общей площадью от 56,71 до 61,68 кв. м), трехкомнатных – 25 (общей площадью 71,24 и 73,15 кв. м). Общая площадь квартир – 7977,07 кв. м.

**Строительная готовность жилых помещений**

- частичная внутренняя отделка: штукатурка стен и перегородок, стяжка пола, монолитные железобетонные потолки;
- вентиляция – естественная по схеме: приток через окна, вытяжка через каналы унифицированных вентблоков;
- электроснабжение – поквартирная черновая разводка электропроводки с установкой розеток, выключателей, звонка, электросчетчика, без установки электроплиты;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, полотенцесушитель;
- канализация – стояк, установка и подключение унитаза;
- отопление водяное – скрытая в полу разводка, отопительные приборы (радиаторы, конвекторы);
- окна и двери на лоджии – из ПВХ профиля со стеклопакетом;
- остекление лоджий – из ПВХ профиля со стеклопакетом;
- телефонизация, телефикация, интернет – ввод сетевого кабеля в квартиру, оптическая розетка;
- видеодомофон;
- дверь входная деревянная;
- пожарный шланг;
- автономный пожарный извещатель.

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика (на дату опубликования проектной документации):**

10 (десять) двухкомнатных квартир общей площадью по проекту общей площадью от 56,71 до 61,68 кв. м. Стоимость за 1 (один) кв. м общей площади квартиры – 2400 (две тысячи четыреста) белорусских рублей при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период по графику платежей – 2500 (две тысячи пятьсот) белорусских рублей.

Условия заключения договоров создания объекта долевого строительства:

1. При заключении договора участник долевого строительства вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров на момент заключения договора создания объекта долевого строительства.

2. Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях, перечисляется дольщиком на специальный и расчетный счет застройщика в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договоров создания объекта долевого строительства осуществляются, начиная с первого рабочего дня, следующего за днем опубликования настоящей декларации, в порядке живой очереди по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Со дня начала заключения договоров создания объекта долевого строительства прием и регистрация заявлений на заключение договоров осуществляется при заключении договоров. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ООО «СИ-трейдинг» вправе заключить договор с другим претендентом.

Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке: застройщик вправе изменить цену договора (цену объекта долевого строительства) в случаях изменения прогнозных индексов цен в строительстве в нормативный срок строительства объекта строительства и дополнительный срок строительства при продлении нормативного срока строительства в установленном законодательством порядке в случае отсутствия вины застройщика, а также изменения законодательства об уплате косвенных налогов в указанные сроки, если они оказали влияние на цену договора (цену объекта долевого строительства).

В возводимом жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров по которым должно отдаваться предпочтение гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

**Данные о вещном праве на земельный участок, предоставленном застройщику для строительства объекта долевого строительства, его границах и площади, элементах благоустройства**

Земельные участки находятся в постоянном пользовании ООО «СИ-трейдинг» с целевым назначением для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой, смотровых колодцев и инженерных сетей по объекту «Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение улицы Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой». Свидетельство (удостоверение) №№ 600/1072-14293, 600/1072-14292, 600/1072-14291, 600/1072-14290, 600/1072-14289 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право постоянного пользования) с кадастровым номером 623680604101000376 площадью 0,5308 га, с кадастровым номером 623680604101000375 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000374 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000373 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000372 площадью 0,0001 га, расположенные по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Копище, составленные РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру 24 мая 2019 года.

Проектом предусмотрено благоустройство придомовой территории, включая строительство площадок для парковки легкового автомобильного транспорта, тротуаров, пешеходных дорожек, площадки для игр детей, сбора твердых бытовых отходов.

**Функциональное назначение нежилых помещений в жилом доме, не входящих в состав общего имущества:** два встроенных помещения административного назначения с отдельными входами на первом этаже, машино-места в подземном гараже-стоянке, объекты магистральной и распределительной инженерной инфраструктуры, финансируемые при строительстве объекта, которые будут переданы эксплуатирующим их организациям в установленном законодательством порядке.

**Общее имущество жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию данного дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** в состав общего имущества совместного домовладения, поступающего в общую долевую собственность всех дольщиков, входят помещения инженерного назначения (электрощитовая, тепловой пункт, лифтовые шахты, водомерный узел, насосная), коридоры общего пользования, кладовые для уборочного инвентаря, лифты, лестнично-лифтовые холлы, межэтажные лестницы, тамбуры, конструкции, водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилого дома, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства (площадки для раздельного сбора бытовых отходов, уличные парковочные места, проезды, тротуары, детская площадка), а также внутриплощадочные и внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения жилого дома. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего имущества совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации многоквартирного жилого дома и передаются застройщиком по акту приемки-передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода в эксплуатацию это товарищество создано. Если такое товарищество не создано, – лицу, определяемому общим собранием дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

**Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома:** август 2020 года.

**Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком:** договор строительного подряда № 22/05-2018 от 22.05.2018 г., заключенный застройщиком со строительным унитарным предприятием «СИ-трейдинг-Строй».

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by.

Срок действия настоящей декларации – до опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие либо изменяет опубликованной ранее.

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» проводит 20 сентября 2019 года: в 10.00 повторный открытый аукцион по продаже объектов основных средств:

Лот № 1

| Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 50 %, бел. руб., без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 19 зданий и сооружений производственной базы* | 1019004,03 | Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 274А | 101900,00 |

Лот № 3

| Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 90 %, бел. руб., без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 15 зданий, 10 сооружений, 1 единица оборудования и зеленые насаждения битумной базы* | 23 138,10 | Могилевская обл., Бобруйский р-н, южнее д. Ковали (в районе ст. Телуша) | 2313,00 |

* список основных средств находится на сайте ОАО «ДСТ № 3» www.dst3.by

в 15.00 повторный открытый аукцион по продаже объектов основных средств:

| | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи бел. руб., без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Бульдозер «ДЗ-110», тип ТС – бульдозер гусеничный, 1988 г. в. | 6 300,00 | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 156 | 630,00 |
| Лот № 4 | Прицеп «2 ПТС-4.5», тип ТС – прицеп тракторный, 1998 г. в. | 1 500,00 | | 150,00 |
| Лот № 5 | Здание мобильное «М-К1-3», тип ТС – прицеп, 2000 г. в. | 1 700,00 | | 170,00 |

Лот № 6

| Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 50 %, бел. руб. без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Автомобиль Volkswagen Passat, тип ТС-легковой специальный универсал (после ДТП) | 1 130,00 | Могилевская область, г. Могилев, проезд Славгородский, 15 | 113,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.
2. Дата, время и место проведения аукциона: 20.09.2019 в 10.00 и 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB 3012 1192 4101 1933 0000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 18.09.2019 г.; время: 17.00.
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.
8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3» www.dst3.by

## Уважаемые акционеры!

ОАО «МАПИД» сообщает, что выплата дивидендов за I полугодие 2019 года будет осуществляться в период с 2 сентября 2019 года по 15 октября 2019 года.

Установленный размер дивидендов на одну акцию за I полугодие 2019 года составляет – 0,1393625 рубля.

Внеочередным общим собранием акционеров ОАО «МАПИД» от 15 августа 2019 года установлен следующий порядок и сроки выплаты:

- на долю собственности Республики Беларусь – путем перечисления на расчетный счет Главного управления Минфина по г. Минску не позднее 22.09.2019;
- на долю собственности г. Минска – путем перечисления на расчетный счет финотдела администрации Фрунзенского района не позднее 22.09.2019;
- работникам Общества, юридическим лицам – путем перечисления на расчетные счета – с 02.09.2019 по 15.10.2019;
- физическим лицам, не работникам Общества – путем перечисления через депозитарий «Лидеринвест» с последующей выплатой; по заявлению акционера – почтовым переводом – с 02.09.2019 по 15.10.2019.
- физическим лицам, не работникам Общества, имеющим право на стандартные вычеты по подоходному налогу – по заявлению акционера путем перечисления на электронные карточки.

Депозитарий ЗАО «Лидеринвест» располагается по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, д. 41, оф. 512. При обращении в депозитарий при себе иметь документ, удостоверяющий личность.

**УНП 100008115**

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ОДО «Н-ОЙЛ» (УНП 190143313, Минский р-н, Ждановичский с/с, 500 м юго-западнее д. Тарасово, пом. 11), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).

***Дата и время проведения торгов:* 27 сентября 2019 года.** Начало – 10.00, окончание – 12.00. Заявки принимаются с 27 августа 2019 года по 26 сентября 2019 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, просп. Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ОДО «Н-ОЙЛ» (УНП 190143313)** в лице управляющего – индивидуальный предприниматель Радченко Кирилл Игоревич.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, руб. | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Металлический сборный гараж, расположенный по адресу: Минский р-н, Ждановичский с/с, 500м, юго-западнее д. Тарасово | 7 300,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |
| 2 | Вилочный погрузчик NISSAN FD01A15Q | 5 900,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |

***Для участия в торгах необходимо:***

1. в срок до 17.00 **26 сентября 2019 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY56MTBK30120001093300086460 в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация»;
2. подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 26.09.2019 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»;
3. в день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», расположенное по адресу: 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А, настоящим информирует, что на основании решения наблюдательного совета от 23 августа 2019 года осуществляется формирование реестра акционеров общества по состоянию на 1 сентября 2019 года для проведения внеочередного общего собрания акционеров 4 сентября 2019 года.

**УНП 400052115**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о снятии объектов с торгов

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о снятии с аукциона по продаже имущества открытого акционерного общества «Молодечнолес», назначенного на **30.08.2019 лотов №№ 1–6, 10–24**.

**УНП 191381372**

Актуальна

**Андрэй ХУДЫК:**

# «Не трэба баяцца ісці да людзей»

## Кіраўнік Мінпрыроды правёў нараду па пытаннях інфармавання насельніцтва аб экалагічнай бяспецы

**З кожным годам грамадства становіцца больш дасведчаным у пытаннях экалагічнага кірунку, і таму людзі ўсё часцей абмяркоўваюць іх на самых розных пляцоўках. На нарадзе ў Мінпрыроды разгледзелі тэму камунікацыі з насельніцтвам.**



Як адзначыў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК,** праблемы ўзнікаюць там, дзе мясцовыя ўлады не гатовыя да дыялогу з насельніцтвам. «Трэба працаваць над тым, каб людзі атрымлівалі дакладную інфармацыю ў даступнай форме, і дасканала выконваць законы», — падкрэсліў ён.

Між тым пры правядзенні дзяржаўнай экалагічнай экспертызы нярэдка ўзнікае шмат пытанняў. На жаль, некаторыя інвестары не думаюць пра экалагічную бяспеку, а дбаюць выключна аб прыбытку.

Андрэй Худык расказаў пра свой рабочы візіт у Салігорск па даручэнні кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай. Там інвестар спрабуе пачаць будаўніцтва прадпрыемства за 20 метраў ад дамоў індывідуальнай жылой забудовы. Натуральна, жыхары пачалі звяртацца ў інстанцыі. Тут варта адзначыць, што ў нашай краіне людзі часта адразу скардзяцца ў рэспубліканскія органы, таму што лічаць: мясцовыя ўлады не могуць паўплываць на сітуацыю. Па словах Андрэя Худыка, у Салігорску проста абуральны выпадак — інвестар паставіў капітальны плот, пачаў будаўнічыя работы, не маючы на руках станоўчага заключэння дзяржаўнай экалагічнай экспертызы. «І да нашых тэрытарыяльных структур таксама ёсць пытанні, як такое магчыма», — сказаў міністр.

**Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама Вольга ТОПДЭМІР** паведаміла, што сітуацыя ў Салігорску на кантролі, і шляхі яе вырашэння спрабуюць знайсці на абласным узроўні.

Удзельнікі нарады не толькі актыўна абмяркоўвалі тэму, але і вялі дыскусію. Адзначалася, што беларусы адчувальныя да пытанняў экалагічнай бяспекі пасля трагічнага вопыту — аварыі на ЧАЭС. На думку **намесніка міністра энергетыкі Вольгі ПРУДНІКАВАЙ,** сёння неабходна тлумачыць людзям станоўчыя фактары наяўнасці ў краіне сваёй АЭС. У прыватнасці, гэта зніжэнне долі вуглевадародаў у паліўным балансе і істотнае скарачэнне выкідаў парніковых газаў.

Шэраг канкрэтных прапаноў, накіраваных на прадухіленне негатыўных сітуацый і паляпшэнне інфармавання насельніцтва, выказаў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ.** У прыватнасці, ён мяркуе, што інвестыцыйны дагавор неабходна заключаць на аснове ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе; узмацняць ролю грамадскіх абмеркаванняў праектаў. Некалькі практычных прапаноў унёс **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра дзяржаўнай экалагічнай экспертызы і павышэння кваліфікацыі Мінпрыроды Міхаіл СІМАНЮКОЎ,** у тым ліку ўключыць у склад камісій, ствараемых мясцовымі выканаўчымі органамі ўлады, па выбары зямельнага ўчастка для размяшчэння аб'ектаў, якія плануюцца да будаўніцтва, прадстаўніка Цэнтра дзяржаўнай экалагічнай экспертызы. І таксама Міхаіл Сіманюкоў звярнуў увагу на тое, што па запыце грамадзян заказчыкі гаспадарчай дзейнасці абавязаны прадстаўляць копію заключэння дзяржаўнай экалагічнай экспертызы.

Падводзячы вынікі нарады, кіраўнік Мінпрыроды адзначыў, што ёсць праблема з камунікацыяй. Многіх вострых пытанняў можна было б пазбегнуць, калі б насельніцтву падрабязна і даступна тлумачылі сутнасць тых ці іншых праектаў. «Не трэба баяцца ісці да людзей, — рэзюмаваў Андрэй Худык. — Маё ўражанне ад сустрэчы ў Салігорску: адэкватныя людзі, добразычлівыя, ведаюць заканадаўства. З насельніцтвам трэба весці дыялог на роўных, па-іншаму не атрымаецца. Прафесіяналізм, выкананне заканадаўства і адкрытасць у прыняцці рашэнняў — вось што сёння трэба».

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота прэс-службы Мінпрыроды.**

# КАБ ЗЯМЛЯ НЕ ПЕРАТВАРЫЛАСЯ Ў ПУСТЫНЮ

## Беларусь далучыцца да выпрацоўкі мер супраць дэградацыі зямель

**Чарговая, 14-я па ліку канферэнцыя ўдзельнікаў Канвенцыі ААН па барацьбе з апустыньваннем пройдзе з 2 да 13 верасня ў Дэлі (Індыя).**

Як расказаў **нацыянальны каардынатар КБА ААН Андрэй КУЗЬМІЧ,** для Беларусі, якая актыўна ўдзельнічае ў рабоце канвенцыі, на сустрэчы асабліва важна далучыцца да выпрацоўкі мер па ахове і аднаўленні лясоў і тарфянікаў як ключавых рэсурсаў у барацьбе са зменай клімату, стратай біяразнастайнасці і дэградацыяй зямельных угоддзяў.

— Беларусь едзе на чатырнаццатую сустрэчу ўдзельнікаў з устаноўленымі нацыянальнымі паказчыкамі нейтральнага балансу дэградацыі зямель, а таксама палітычнай воляй да іх дасягнення. У нас ужо назапашаны пэўны практычны вопыт аднаўлення такіх тэрыторый, у прыватнасці тарфянікаў, і мы будзем рады падзяліцца гэтым вопытам, — расказаў Андрэй Кузьміч.

Сярод праблем, на якія звяртае ўвагу канвенцыя, для нашай краіны асабліва актуальныя водная і ветравая эрозіі глебы, мінералізацыя арганічнага рэчыва тарфяных глеб, тэхнагеннае забруджванне, парушэнне зямель падчас здабычы карысных выкапняў і г. д. Акрамя таго, з-за змены клімату ў Беларусі павялічылася колькасць засух. Напрыклад, такога сухога красавіка, як сёлета, не адзначалася ніводнага разу за перыяд з 1940-х гадоў.

Каб стрымаць і мінімізаваць уплыў гэтых працэсаў, у 2015 годзе беларускім урадам зацверджаны Стратэгія па рэалізацыі КБА ААН і Нацыянальны план дзеянняў па прадухіленні дэградацыі зямель на 2016—2020 гады. Створаны адпаведны каардынацыйны савет пад кіраўніцтвам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Адзін з кірункаў дзейнасці, па якім наша краіна знаходзіцца у ліку лідараў, — аднаўленне асушаных тарфянікаў. Для гэтага Беларусь прыцягвае ў тым ліку і міжнародныя сродкі. Так, рэалізаваны праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі Рэспублікі Карэя і КБА ААН «Аднаўленне асушаных тарфянікаў у Беларусі». На працягу года ў Магілёўскай вобласці было адноўлена больш за 1000 га дэградзіраваных і неэфектыўна асушаных балот.

«Мы чакаем ад канферэнцыі прыняцця рашэнняў, якія дапамагалі б краінам прасунуцца ад устанаўлення нацыянальных задач нейтральнага балансу дэградацыі зямель да іх практычнай рэалізацыі. Адным з ключавых пытанняў на гэтым шляху з'яўляецца мабілізацыя рэсурсаў. Таксама неабходна кваліфікавана прааналізаваць справаздачы краін пасля прыняцця новых стратэгічных рамак КБА ААН і зрабіць усё магчымае, каб у будучыні атрымліваць рэпрэзентатыўныя даныя аб прагрэсе ў дасягненні стратэгічных мэт і задач канвенцыі, а таксама задач 15 Мэты ўстойлівага развіцця», — дадаў Андрэй Кузьміч.

Чакаецца, што падчас канферэнцыі бакоў краіны разгледзяць вынікі глабальнай ацэнкі па дэградацыі зямель. Яна ўпершыню была праведзена з дапамогай дыстанцыйнага зандзіравання і верыфікацыі даных нацыянальнымі экспертнымі групамі. Гэта дазволіць устанавіць базавую лінію па стане якасці зямель на перыяд з 2015 года.

На парадку дня таксама будзе пытанне па засухах — якія механізмы па змякчэнні іх наступстваў могуць быць распрацаваны ў рамках канвенцыі. Пагавораць эксперты і пра важнасць прынцыпаў адказнага землеўладання для дасягнення нейтральнага балансу дэградацыі зямель.

**Настасся АЛЯКСЕЕВА.**

Тэма нумара

# Адходы: выкарыстоўваць ці захоўваць?

## Што плануецца рабіць, каб сталіца, ды і краіна ў цэлым, у хуткім часе не патанула ў гарах смецця

**З 1 жніўня на тэрыторыі сталічнага палігона «Прудзішча» спыніўся прыём адходаў на захаванне. Гэта значыць, што ў межах Мінска і Мінскага раёна застаўся адзіны падобны аб'ект, куды трапляюць усе адходы ад фізічных і юрыдычных асоб, — «Трасцянецкі». Нягледзячы на тое, што гэты палігон — самы малады (ён дзейнічае з 2007 года), з закрыццём «Прудзішча», а раней і «Паўночнага» нагрузка на яго моцна ўзрасла. І праз некалькі гадоў праблема, куды падзець смецце, стане вострай...**

### Для энергетычных мэт

Адзін з варыянтаў для яе вырашэння — пабудаваць новы палігон. Над гэтым праектам сёння працуюць у камунальным унітарным прадпрыемстве па абыходжанні з адходамі «Экарэс». Як паведаміў **дырэктар прадпрыемства Аляксандр ЛІСОЎСКІ,** прапрацоўваецца пытанне і рыхтуецца праект па выдзяленні ўчастка плошчай ад 22 да 24 га для стварэння яшчэ аднаго палігона ў магілёўскім напрамку, які будзе адпавядаць усім неабходным патрабаванням экалагічнай бяспекі.

— Не адмаўляюцца ад ідэі і выкарыстання адходаў для атрымання цеплавой і электраэнергіі, расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Вольга САЗОНАВА.** Першапачаткова ў Нацыянальнай стратэгіі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі на перыяд да 2035 года прадугледжвалася будаўніцтва каля Мінска завода для спальвання смецця. Але цяпер для гэтых мэт плануецца не ствараць новую вытворчасць, а рэканструяваць адну са сталічных ЦЭЦ — яна будзе пераводзіцца з выкарыстання традыцыйных відаў паліва на камунальныя адходы. Падобныя тэхналогіі сёння дзейнічаюць у Эстоніі — з 2013 года на ЦЭЦ «Enefit Green» у Таліне ўведзены ў эксплуатацыю блок для спальвання смецця. Сёння на ім перапрацоўваецца каля паловы ўсіх змяшаных бытавых адходаў, што ўтвараюцца ў краіне.

— Падрыхтаваны праект распараджэння прэм'ер-міністра аб стварэнні рабочай групы па прапрацоўцы пытання спальвання на ЦЭЦ у Мінску ЦКА і зацвярджэння адпаведнага плана мерапрыемстваў, — расказала Вольга Сазонава. — Цяпер праводзяцца падрыхтоўчыя работы, у тым ліку вызначэнне аб'ёмаў адходаў, якія могуць пастаўляцца на ЦЭЦ, іх марфалагічны склад, фізіка-хімічныя характарыстыкі і «каларыйнасць».

Спецыялістам таксама неабходна будзе вывучыць адходы попелу, што ўтвараюцца падчас спальвання, на прадмет небяспекі для наваколля і здароўя людзей і разгледзець варыянты іх утылізацыі ці выкарыстання.



У краінах ЕС шмат увагі ўдзяляецца першаму этапу збору адходаў — сартаванні на месцы іх утварэння.

Увогуле цвёрдыя камунальныя адходы для атрымання цеплавой і электрычнай энергіі сёння выкарыстоўваюцца ў многіх краінах Еўропы, у тым ліку ў Германіі, Даніі, Швецыі. У апошняй, напрыклад, дзейнічае каля 40 заводаў для спальвання смецця, дзе ўтылізуецца каля паловы ўсіх ЦКА.

— У Беларусі не плануецца будаваць столькі прадпрыемстваў, як у Швецыі, — важна паглядзець, як гэты механізм будзе працаваць для Мінска, — адзначыла Вольга Сазонава. — Іншыя ж рэгіёны могуць па-іншаму выкарыстоўваць змяшаныя камунальныя адходы. Напрыклад, на Гродзеншчыне, дзе шмат цэментавых заводаў, з іх можна атрымліваць RDF-паліва.

Важным застаецца пытанне падтрымання на такім прадпрыемстве высокага ўзроўню экалагічнай бяспекі.

— Пры выкананні ўсіх экалагічных патрабаванняў да такога аб'екта яго дзейнасць прынясе значна менш шкоды наваколлю і здароўю чалавека, чым эксплуатацыя палігонаў ЦКА па старых тэхналогіях, — падкрэсліла Вольга Уладзіміраўна.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

Далучайцеся!

# Прабежкі па... смецце

## Як плогеры прыбіраюць сталіцу

**А вы спрабавалі калі-небудзь бегаць і збіраць смецце адначасова? Калі так, віншуем: вы — плогер! Не? Можа, самы час пачаць? Зусім нядаўна ў нашай краіне стартаваў праект Plogging Belarus, які прапануе ўсім ахвотным сумясціць карысныя заняткі і забіць адразу двух зайцоў — умацаваць сваё здароўе і дапамагчы прыродзе.**



Падчас забегаў плогеры сабралі 769 кг смецця, з іх каля паловы не перапрацоўваецца.

### ДЛЯ ЛЮБОГА ЎЗРОСТУ І ФІЗІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

Сёння плогінг — гэта папулярны экалагічны рух, але яшчэ тры гады таму пра яго ніхто не ведаў. Усё пачалося ў Швецыі з неабыякавых людзей, якія на прабежцы збіралі смецце і затым выкладвалі яго фатаграфіі ў сацыяльныя сеткі, каб прыцягнуць увагу да праблемы. Экаактывіст Эрык Альстром вырашыў зрабіць гэтыя забегі арганізаванымі і запусціў праект Plogga. Пасля чаго да руху далучылася больш за 40 краін.

У Беларусь жа плогінг прыйшоў дзякуючы Аляксандру Беўзу. Ён ужо даўно хацеў арганізаваць у нас экалагічныя забегі, але ўсё ніяк «рукі не даходзілі».

— Зразумеў, што пара дзейнічаць, калі ўбачыў у інтэрнэце пост знаёмай з падобнай прабежкі. Звязаўся з Цэнтрам экалагічных рашэнняў, каб атрымаць неабходную кансультацыю па месцах прыборкі і сартавання смецця. На просьбу адгукнулася яго супрацоўніца Наталля Блышчык. Я хоць і стараюся весці экалагічна дружалюбны лад жыцця, але ўсё ж у некаторых пытаннях, лічу, лепш давярыцца прафесіяналам, — расказаў Аляксандр.

Першы забег прайшоў 1 мая ў Лошыцкім яры. З таго часу было яшчэ два забегі. Вызначыцца з месцам дапамагае спецыяльная карта забруджаных тэрыторый на сайце праекта «Зробім!». Па словах Аляксандра, перад тым, як «запускаць» на лакацыю плогераў, ён сам уважліва яе вывучае. Там не павінна быць зараснікаў і небяспечных участкаў, але павінна быць смецце, каб эфектыўна выкарыстоўваць працу ўдзельнікаў.

Тым не менш плогінг — гэта сімбіёз бегу і прыборкі, таму зацыклівацца толькі на смецці нельга. Менавіта таму забегі праходзяць на час, каб ніхто не адставаў. Дыстанцыі могуць адрозніваццца. Напрыклад, першы раз трэба было пераадолець 3,5 км, а ў найбліжэйшы ўжо плануецца каля 6 км. На ўсіх лакацыях ёсць некалькі кантрольных пунктаў, дзе ўдзельнікі могуць выкінуць смецце, якое потым адсартуюць валанцёры.

— Некаторыя думаюць, што мы запрашаем толькі спартсменаў, але гэта зусім не так. Людзі прыходзяць абсалютна рознага ўзросту і з рознай фізічнай падрыхтоўкай — гэта не мае значэння, плогінг падыходзіць усім! Праблема ўзнікае толькі з тым, што часта ў нас удзельнікі дзеляцца на два лагеры: адны хочуць усё прыбраць да апошняй паперкі, а гэта фізічна немагчыма падчас забегу, другія, наадварот, — больш прабегчы. Аднак гэта нават да лепшага. Першым мы прывіваем любоў да спорту, другім расказваем пра экалагічныя праблемы, — адзначыў Аляксандр.

### «ТЫ ЎЖО НЕ МОЖАШ ПРАБЕГЧЫ МІМА СМЕЦЦЯ»

На забег плогераў просяць прыносіць свае старыя пальчаткі, пакеты, шматразовыя бутэлечкі і тэрмакубкі (калі чагосьці няма, то арганізатары падзеляцца). Гэта прынцыповая частка праекта — не проста прыбраць смецце, а і ўвогуле яго не ствараць і тлумачыць іншым, чаму звычайнай прыборкай і сартаваннем праблему не вырашыць.

— Я доўга думаў, як можна пераканаць людзей, якія смецяць, гэтага не рабіць. І прыйшоў да высновы, што калі чалавек свядома пакідае горы бутэлек у лесе ці парку, то тут ужо складана нешта змяніць. У той жа час многія не ведаюць ці не задумваюцца, што той жа недакурак — гэта не проста папера, у яго фільтры ёсць мікрапластык, які не раскладваецца яшчэ сотні гадоў і лёгка можа трапіць у ваду, глебу і да нас у ежу, — падкрэсліў Аляксандр.

У планах каманды праекта ў канцы сезона накіраваць ліст у Мінгарвыканкам, каб заявіць пра сябе, а таксама ініцыяваць устаноўку сметніц у тых месцах, дзе яны прыбіраюць: пакуль іх там недастаткова ці зусім няма. Акрамя гэтага, прыцягнуць да забегу буйныя кампаніі, чыю ўпакоўку часцей за ўсё знаходзяць удзельнікі.

Аляксандр не мае ілюзій, што плогінг у адно імгненне дапаможа вырашыць праблему са смеццем і з тымі, хто яго стварае. Але лічыць, што асабісты прыклад абавязкова прымусіць задумацца тых людзей, якія знаходзяцца побач. Напрыклад, ён у свой час змог натхніць калег збіраць накрыўкі ад бутэлек, і, хоць даўно ўжо не працуе з імі, яны працягваюць гэтым займацца. Так і з любімым паркам або скверам. Калі людзі будуць бачыць, што хтосьці за ім даглядае, магчыма, і ў тых, хто смеціць, ужо не падымецца рука выкінуць недакурак на траву. А там, глядзіш, «паглыбяцца ў тэму» і самі стануць плогерамі.

**Кацярына ЦІТОВА.**

**Наступны забег плогераў пройдзе 7 верасня. Зарэгістравацца можна па спасылцы http://ploggingby.tilda.ws/#rec99127970. Далучайцеся!**

Парадак на зямлі

# Адпачывайце на прыродзе без звалак!

## Неабыякавыя грамадзяне на асабістым прыкладзе паказваюць, як зрабіць наваколле чыстым

**Нягледзячы на тое, што для нашай краіны лета-2019 наўрад ці можна назваць «гарачым сезонам», нават невялікія цёплыя перыяды многія беларусы выкарыстоўваюць для паходаў на прыроду. Пры гэтым значная частка такіх візітаў, на жаль, заканчваецца з'яўленнем міні-звалак, якія турысты пакідаюць пасля сябе. Каб гэтага не адбывалася, паважаныя чытачы, не забывайце падчас свайго чарговага пікніка ці паходу захапіць з сабой смеццевыя пакеты і ачысціць месца адпачынку, нават калі смецце не ваша.**



Грамадскі эколаг Дзмітрый МАГІЛЕЎСКІ вучыць іншых не толькі сплаўляцца на байдарках, але і берагчы прыроду.

Так, напрыклад, зрабіў і грамадскі эколаг Мінска Дзмітрый МАГІЛЕЎСКІ — разам з сябрамі ён прыбраў участак берага ракі Свіслач пры праходжанні маршруту Мінск — Дукора.

«У нашай краіне велізарная колькасць рэк, і мы па меры магчымасці з сябрамі на выхадных адпраўляемся ў сплаў на байдарках. На жаль, пасля наведвання турыстамі вадаёмаў берагі застаюцца з горамі смецця. Таму, калі мы спыняемся, імкнёмся прыбраць і не даваць магчымасці развівацца несанкцыянаваным прыбярэжным звалкам, — расказаў Дзмітрый.

**Часопіс «Родная прырода» і Мінпрыроды запрашаюць неабыякавых людзей, якія дапамагаюць краіне вызваліцца ад смецця, дасылаць фота сваіх экалагічных акцый «да» і «пасля» з невялікім аповедам пра сябе, а таксама пра месца, дату і акалічнасці прыборкі на электронны адрас часопіса pryroda@zviazda.by ці ў нашы групы УКантакце і Facebook. Найлепшыя з іх будуць апублікаваныя на старонках «Роднай прыроды».**

**Вераніка КОЛАСАВА.**

# Адходы: выкарыстоўваць ці захоўваць?

### Другасныя рэсурсы — не для палігона

Сёння ў краіне дзейнічае каля 160 палігонаў і 840 міні-палігонаў. Многія з гэтых аб'ектаў не адпавядаюць сучасным патрабаванням экалагічнай бяспекі, таму павінны быць закрытыя.

— Такія аб'екты з цягам часу ператвараюцца ў моцную крыніцу забруджвання атмасфернага паветра, глеб і падземных вод, — адзначыла Вольга Сазонава. — Паводле даных Рэспубліканскага цэнтра аналітычнага кантролю ў вобласці аховы навакольнага асяроддзя, у 2018 годзе перавышэнні фонавых канцэнтрацый забруджвальных рэчываў падземных вод у 10 разоў і больш зафіксаваны на 25 % палігонаў краіны.

Акрамя таго, у працэсе захавання адходаў на палігонах утвараецца так званы звалачны газ — сумесь метану і вуглякіслага газу (парніковых газаў). Вырашыць гэту праблему дапамагаюць біягазавыя ўстаноўкі, якія выкарыстоўваюць «звалачны газ» для вытворчасці цеплавой і электраэнергіі. Але пакуль у нашай краіне такая практыка не вельмі распаўсюджана — падобныя ўстаноўкі дзейнічаюць толькі на сталічных палігонах «Трасцянец» і «Трасцянецкі», «Паўночны», а таксама ў Магілёўскім, Аршанскім, Віцебскім, Гомельскім, Полацкім раёнах.



З 1 жніўня на палігоне «Прудзішча» спынілася захаванне адходаў.

— Замест міні-палігонаў і адпрацаваных палігонаў неабходна стварыць рэгіянальныя комплексы, якія будуць адпавядаць сучасным патрабаванням і дапамогуць рашыць лакальна вялікую колькасць праблем, — упэўнена эксперт.

### Аддзяліць паперу ад... баршчу

Яшчэ адна важная праблема, якая ўплывае на рост палігонаў, — недастатковы ўзровень выкарыстання другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР). На жаль, сёння многія грамадзяне лічаць непатрэбным сартаваць свае адходы. Так у кантэйнеры для змяшаных адходаў трапляюць пластык, шкло, папера, якія потым з-за бездакназнасці спецыялістаў захоўвацца на палігонах. Толькі за першае паўгоддзе 2019 года падчас праверак Мінпрыроды было выяўлена 1252 факты захавання ДМР.

— Узмацненне кантролю Мінпрыроды ў адносінах да забароны захавання ДМР, выкананне схем абыходжання з ЦКА і меры з боку мясцовых улад дазволілі дасягнуць пэўных вынікаў у сферы абыходжання з адходамі, — адзначыла Вольга Сазонава. — За першае паўгоддзе 2019 года ўзровень выкарыстання ЦКА склаў 25,4 % (за аналагічны перыяд 2018-га — каля 17,6 %).

Але каб дасягнуць узроўню другіх еўрапейскіх краін (у Швецыі і Швейцарыі збіраецца паасобна 33 % адходаў, у Германіі — 48 %), трэба змяняць падыходы да гэтай дзейнасці яшчэ на першым этапе — каля крыніцы ўтварэння. І галоўнае, што стрымлівае рост сартавання адходаў, — нястворанае для гэтага ўмовы арганізацыямі, што абслугоўваюць жылфонд.

Выправіць сітуацыю прызваны тэхнічны кодэкс устаноўленай практыкі абыходжання з камунальнымі адходамі, які цяпер распрацоўваецца. У выніку для такой дзейнасці будуць існаваць адзіныя патрабаванні — адзіныя падыходы да аснашчэння кантэйнернага парку, стварэння датковай колькасці пляцовак і г. д.

Але, па словах Вольгі Сазонавай, дакумент не вырашыць усе праблемы. Неабходна яшчэ на стадыі праектавання прадугледжваць розныя тэхнічныя рашэнні для збору адходаў — пачынаючы ад выдзялення асобных памяшканняў да выкарыстання пнеўматранспарту.

Хвалюе спецыялістаў прыродаахоўнага ведамства і тэндэнцыя, калі розныя віды ДМР збіраюцца ў адзін кантэйнер, а потым ідуць на сартаванне ці дасартаванне.

— З пункту погляду Мінпрыроды такая сістэма не адпавядае мэтам паасобнага збору і павышае выдаткі на сартаванне, — адзначыла Вольга Сазонава. — Прыярытэтным павінен быць збор шкла, пластыку і паперы ў розныя кантэйнеры.

У Беларусі ёсць пэўныя зрухі адносна збору раслінных астаткаў (лісця, травы, галін), але харчовай арганіцы амаль не ўдзяляецца ўвагі. Пры гэтым менавіта яна — галоўны забруджвальнік другасных матэрыяльных рэсурсаў.

Па словах эксперта, сёння таксама важна працаваць над укараненнем тэхналогій для матэрыялаў, якія пакуль у нашай краіне не перапрацоўваюцца, і тэхналогій кампаставання адходаў. Акрамя таго, плануецца распрацаваць нарматыўныя прававы акт аб паэтапным зніжэнні выкарыстання поліэтыленавай упакоўкі з яе замяшчэннем экалагічна бяспечнай.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

**Фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Ёсць пытанне

# Куды перасяліць буслоў?

## Мінпрыроды сумесна з Мінэнерга і НАН Беларусі шукаюць шляхі вырашэння праблемы: як захаваць гнёзды буслоў, размешчаных на паветраных лініях электраперадачы



Укладка слоя саломы для высцілання асновы гнязда.

**БУСЕЛ з'яўляецца сімвалам Беларусі, на падсвядомым узроўні мы верым, што гэтая птушка — прадвеснік добрых падзей. Мы захапляемся нават, калі бачым на кожнай апоры паветраных ліній электраперадачы па гняздзе, маўляў, шчаслівае месца. Аднак у электрыкаў на гэты конт іншае меркаванне.**

Традыцыйна буслы гнездаваліся побач з чалавекам. Раней для свайго дома птушкі часцей за ўсё выбіралі высокія векавыя дрэвы ў вёсках ці на іх ускраінах, а таксама сельскагаспадарчых угоддзях і лугах. Акрамя таго, людзі самі прыцягвалі гэтых птушак на дахі дамоў, гаспадарчых і іншых пабудоў.

За апошнія гады старых дрэў па аб'ектыўных прычынах стала менш. Цяпер у вёсках убачыць гнездо бусла на даху дома — вялікая рэдкасць. На дахах замест прыродных матэрыялаў трыснягу, саломы і драніцы з'явіліся шыфер, метал і іншае, у выніку чаго крылатыя не ў стане пабудаваць на іх гнёзды самастойна. Перасталі людзі рабіць і штучныя платформы для буслоў на слупах, дахах і дрэвах. Таму птушкі ўсё часцей сталі выбіраць апоры ЛЭП. Аднак у такім выпадку самі буслы падвяргаюцца небяспецы.

Як адзначае **кандыдат біялагічных навук, загадчыца лабараторыі арніталогіі НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Ірына САМУСЕНКА**, гэты тып гнездавання стварае пагрозу для папуляцыі буслоў з-за ўзрастання верагоднасці гібелі птушак ад паражэння электратокам або сутыкнення з правадамі, а таксама ўзгарання гнёздаў альбо іх разбурэння пасля аварый на электрасетках. Птушкі могуць стаць прычынай гэтых самых аварый, а значыць, перабояў у падачы электрычнасці.

Варта адзначыць, што гэтая праблема ўзнікла не сёння, а некалькі гадоў таму. Падчас планавага абслугоўвання ЛЭП электрыкі проста здымалі гнёзды. Бо калі здарыцца аварыя на ўчастку — адказваць будзе канкрэтны майстар. Больш за тое, заканадаўства аб ахове і выкарыстанні жывёльнага свету не забараняе спецыялістам, якія займаюцца тэхнічным абслугоўваннем і рамонтам паветраных ЛЭП, выдаляць гнёзды буслоў па-за перыядам гнездавання птушак.

Паводле даных Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах, цяпер больш за 40 % гнёздаў буслоў размешчана на апорах ЛЭП, што, як ужо адзначалася, непажадана і для буслоў, і для людзей. Для выпрацоўкі ўзгодненага рашэння па праблеме захавання гнёздаў буслоў, размешчаных на паветраных лініях, і недапушчэння аварыйных сітуацый Мінпрыроды ў пачатку жніўня правяло нараду, запрасіўшы прадстаўнікоў усіх зацікаўленых арганізацый.

«Удзельнікі нарады пагадзіліся, што адным са спосабаў вырашэння праблемы з'яўляецца мантаж штучных платформаў для гнёздаў буслоў на дзеючых апорах ЛЭП на вышыні больш за адзін метр над правадамі, які паспяхова зарэкамендаваў сябе ў краінах з высокай колькасцю гэтага віду птушкі — у Польшчы, Украіне, Літве і іншых, — падае даміў **кансультант аддзела біяразнастайнасці галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Віталь КАРАНЧУК**. — Іншы спосаб — гэта адцягненне буслоў ад будаўніцтва гнёздаў на паветраных лініях шляхам установак штучных платформаў у сельскіх населеных пунктах у бяспечных для птушак месцах: на высокіх дрэвах, дахах розных пабудоў, спецыяльных слупах. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што з гадамі вага гнязда можа дасягаць 700 і больш кілаграмаў».

Праблема гнездавання буслоў на ЛЭП вядомая і нашым суседзям. Так, у 2014 годзе ў рамках 1-й Міжнароднай канферэнцыі па белым бусле ў Зялёнай Гуры (Польшча) адбыўся майстар-клас па ўстаноўцы штучнай платформы для гнёздаў гэтай птушкі.

Добра ведаючы звычкі птушак, навукоўцы НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах пад кіраўніцтвам Ірыны Самусенкі распрацавалі «Рэкамендацыі па ўстаноўцы штучных гняздоўяў для белых буслоў». У дапаможніку разглядаюцца розныя варыянты ўстаноўкі гнёздаў, у прыватнасці, на драўляных і бетонных слупах. Дадзены падрабязныя рэкамендацыі, чарцяжы платформы для гнязда. Навукоўцы прапануюць у якасці альтэрнатывы старым гнёздам на апорах паветраных ліній усталёўваць штучныя платформы.

**Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ, дырэктар грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны»:**

— Мы з калегамі наведвалі Літву з нагоды праблемы птушкі і ЛЭП. Трэба сказаць, што беларускія энергетыкі абышлі гэту краіну ЕС у пытанні выкарыстання адмысловых элементаў, якія ізалююць птушак ад небяспечных участкаў ЛЭП. Акрамя гэтага, цяпер ідзе паступовая замена аголенага паветранага провада найбольш масавых ЛЭП 0.4-10 кВ на ізаляваны, даражэйшы, але больш надзейны і бяспечны для птушак. На нарадзе энергетыкі агучылі, што 57 % кабелю ўжо заменена! Яшчэ паўгода таму мала хто з прыродаахоўнікаў верыў, што інжынеры возьмуцца за распрацоўку тэхнічных умоў для бусліных платформаў. Кансэнсус, не кампраміс можа быць знойдзены і тут.

**Карысна!**

Усе ахвотныя могуць азнаёміцца з гэтымі рэкамендацыямі навукоўцаў на сайце Мінпрыроды ў раздзеле «Метадалагічныя рэкамендацыі» па адрасе: http://minpriroda.gov.by/ru/metodrekomend/.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

**Фота з «Рэкамендацый па ўстаноўцы штучных гняздоўяў для белых буслоў».**

---

У свеце жывёл

# Чырванавухая пагроза

## Чаму не варта купляць чарапашак у пераходах і на вуліцы

**У большасці людзей ёсць даволі ўстойлівае ўяўленне пра тое, хто такія чарапахі. Гэтыя істоты заўсёды асацыяваліся з марудлівасцю і мірным характарам. Акрамя таго, многія іх віды цяпер знаходзяцца на мяжы знікнення. Ці такая чырванавухая чарапаха, якую летам часта прапануюць пакупнікам на вуліцах горада? Зусім не.**

### ЭФЕКТНАЯ АМЕРЫКАНКА

У адрозненне ад многіх чарапах, гэты від экалагічна пластычны, схільны да засваення новых месцаў пражывання, актыўны і мабільны (адносна для чарапах). Ён здольны перасякаць адлегласці ў некалькі кіламетраў, пераждываць неспрыяльныя ўмовы ў стане анабіёзу («спячкі», калі працэсы ў арганізме настолькі замаруджаны, што амаль цалкам адсутнічаюць бачныя прыкметы жыцця), у тым ліку пры нізкай тэмпературы зімаваць, закапаўшыся ў грунт нават у неглыбокіх вадаёмах.

У сілу шэрагу асаблівасцяў — афарбоўка маладых жывёлін, адносная іх даступнасць для набыцця і цэлы комплекс памылковых думак (як прадаўцоў, так і пакупнікоў) пра біялагічныя асаблівасці віду — гэтая чарапаха вельмі папулярная ў якасці хатняга гадаванца і нярэдка прадаецца ў месцах масавага збору людзей.

Маладыя асобіны выглядаюць вельмі эфектна і ярка, маюць упрыгожаны жоўтымі плямамі ярка-зялёны карапакс (спінны шчыт панцыра), які з узростам становіцца аліўкавым або брудна-жоўтым. Пластрон (брушны шчыт панцыра) альбо жоўты з цёмным кантам па краі, альбо з жоўтымі палосамі. На галаве, шыі, канечнасцях ёсць малюнак з плям, палос белага і зялёнага колеру. Найбольш характэрнай прыкметай з'яўляецца наяўнасць у раёне вачэй дзвюх падоўжных ярка-чырвоных плям, у некаторых падвідаў яны могуць быць жоўтымі або аранжавымі.

Чырванавухая чарапаха мае сярэдні памер. У нейкай ступені такая фармулёўка ўводзіць у зман тых, хто жадае ўтрымліваць яе ў хатніх умовах. Даўжыня карапакса дарослай асобіны рэдка перавышае 30-35 сантыметраў. У любым выпадку, і гэтыя памеры ў хатніх акварыумах вялікія. Нават для маладой чарапахі неабходны акварыум аб'ёмам не менш за 100 літраў, з уладкаваным выхадам на сушу, на долю якой павінна прыходзіцца каля чвэрці ўсёй плошчы.

### З ДОМУ НА ВОЛЮ

Акрамя адносна хуткага павелічэння ў памерах, з узростам мяняецца і афарбоўка гэтых чарапах. Панцыр становіцца практычна чорным, што памяншае іх першапачатковую прывабнасць. Дарослыя чырванавухія чарапахі — гэта моцныя і агрэсіўныя драпежнікі, якіх вельмі цяжка прыручыць. Да таго ж яны патрабуюць пастаяннага догляду. У прыватнасці, рэгулярнай змены вады, наяўнасці даволі дарагога абсталявання і асаблівай дыеты. Усё гэта ў сукупнасці прыводзіць да таго, што многія ўладальнікі, асабліва няправільна інфармаваныя пры куплі, з часам пачынаюць шукаць варыянты пазбаўлення ад гадаванца. Не дзіўна, што многія заакуткі, заалагічныя кафедры ўніверсітэтаў, заапаркі, дзіцячыя экацэнтры, а часта і заамагазіны літаральна перапоўнены дарослымі чарапахамі, якіх з задавальненнем аддаюць туды гаспадары.

Аднак сярод уладальнікаў сустракаюцца і тыя, хто выпускае гадаванцаў у натуральныя вадаёмы. Яны не думаюць пра тое, што чарапахі будуць вымушаныя пастаянна змагацца за выжыванне, у тым ліку з неспрыяльнымі для іх кліматычнымі ўмовамі. У цяперашні час ва Усходняй Еўропе, і ў Беларусі ў тым ліку, сустракаюцца пакуль адзінкавыя выпадкі рэгістрацыі ў натуральных вадаёмах чарапах, якія паспяхова перазімавалі. Але назіраныя тэндэнцыі змены клімату ў перспектыве могуць прывесці да знішчэння перад гэтым відам асноўнай перашкоды для экспансіі.



Афарбоўка дарослай рэптыліі істотна адрозніваецца ад афарбоўкі маладых жывёлін.

Чырванавухая чарапаха ўжо актыўна пракралася ў натуральныя экасістэмы больш чым 30 краін Еўропы, Паўднёва-Усходнюю Азію, Аўстралію. У апошняй па выніках мэтанакіраваных даследаванняў быў доказаны адмоўны ўплыў віду на мясцовую герпетафаўну (паўзуноў). Гэта паслужыла падставай для ўключэння чырванавухай чарапахі ў спіс шкодных відаў на кантыненце. Цяпер такі статус яна мае і ў краінах Еўрасаюза, дзе з 1997 года забаронены яе імпарт.

Сёння важна прадухіліць распаўсюджанне гэтага віду ў Беларусі. У нашай краіне забаронены выпуск чырванавухай чарапахі ў натуральныя экасістэмы, вядзецца асветніцкая работа з трымальнікамі гэтых жывёл. Уладальнікам гадаванцаў важна ведаць, што нельга выпускаць іх на летні перыяд у вадаём на прысядзібным участку, бо пры добрых умовах чарапахі могуць пакінуць яго. Такія факты ўжо былі зафіксаваныя ў розных рэгіёнах Еўропы.

**Алег БАРАДЗІН, кандыдат біялагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі наземных беспазваночных НПЦ па біярэсурсах НАН Беларусі.**

**Не прапусціце «прышэльца»!**

**Паважаныя чытачы! Усе расліны і жывёлы на планеце важныя і неабходныя — гэтую думку мы імкнёмся перадаваць з нумара ў нумар. Аднак ёсць віды, якія, трапляючы ў пэўнае асяроддзе, шкодзяць і прыродзе, і чалавеку. Іх называюць інвазійнымі. Ці ведаеце вы, чым небяспечныя гэтыя «прышэльцы», ці часта іх сустракаеце і як лічыце, ці ўплываюць звычайна людзі на іх распаўсюджванне — дзяліцеся з намі сваімі думкамі. Мы вельмі чакаем вашых адказаў на нашу гарачую пытанку. Знайсці яе можна на старонцы часопіса «Родная прырода» на сайце zviazda.by ці выкарыстаць QR-код.**

Ведай нашых!

# «Робім усё, каб прыцягнуць дзяцей да геалогіі»

## Як юныя геолагі дасягаюць высокіх вынікаў

**«Займацца геалогіяй мяне натхніла наша кіраўніца. Яна змагла паказаць, наколькі гэта навука можа быць цікавай», — расказала пра свой выбар Марына Кузьмар, вучаніца мінскай сярэдняй школы № 53. Яе словы падтрымалі ўсе сябры па камандзе «Юныя геолагі Беларусі», якая прынесла нашай краіне другое месца ў агульным заліку на II Міжнароднай палявой алімпіядзе юных геолагаў у Новасібірску.**

### «ПАЧАЛОСЯ З АВАНТУРЫ»

На спаборніцкі шлях гэта каманда ўстала толькі два гады таму, але ў скарбонцы яе ўдзельнікаў ужо некалькі медалёў і дыпломаў. А пачалося ўсё, як кажуць хлопцы і дзяўчаты, з авантуры, калі ў 2017 годзе яны пагадзіліся ўзяць удзел у 11-й Усерасійскай адкрытай палявой алімпіядзе юных геолагаў, у ходзе якой аргкамітэт прыняў рашэнне аб правядзенні ў яе рамках першай Міжнароднай алімпіяды.

— У Расіі дзіцяча-юнацкі геалагічны рух развіты вельмі добра. Там шмат тэматычных школ і клубаў, і дзеці займаюцца з вельмі раннягa ўзросту. Нядзіўна, што ўсе яны падрыхтаваны на вельмі высокім узроўні. У Беларусі, на жаль, гэта не так распаўсюджана, таму і вопыту ў такіх спаборніцтвах у нас менш, — расказала **настаўнік геаграфіі і кіраўнік каманды Жанна ГВОЗД.** — Калі нас упершыню запрасілі на алімпіяду з такімі сур'ёзнымі сапернікамі, мы насамрэч не ведалі, чаго чакаць. Вырашылі, што паедзем на разведку. Вядома, мы трэніраваліся, але так, як самі гэта разумелі. І першы блін не атрымаўся камяком — вынікам нашага ўдзелу сталі бронзавыя медалі.

Міжнародная алімпіяда праходзіць раз на два гады і складаецца з 11 геалагічных спаборніцтваў, чатырох геалагічных конкурсаў, а сёлета яшчэ дадалі навукова-практычную канферэнцыю. Паставіўшы ў 2017 годзе даволі высокую планку, каманда сёлета ўжо не магла вярнуцца з пустымі рукамі. Па іх словах, разлічвалі хоць на такі ж вынік, як мінулы раз. Таму заслужанае «серабро» парадавала ўсіх.

— Алімпіяда вельмі складаная. У некаторых кірунках, напрыклад «Мінералогія», нам цяжка набраца практычнага вопыту, бо з-за геалагічнай будовы нашай краіны мы не можам убачыць усе горныя пароды і мінералы ў прыродзе. Музейныя экземпляры з'яўляюцца эталоннымі, а на алімпіядзе выкарыстоўваюць палявыя ўзоры. Таму цяпер будзем шукаць прыватныя калекцыі, — расказала Жанна Яўгенаўна.

Для высокага выніку таксама вельмі важна не страціць ужо набыты запал паміж алімпіядамі. Для гэтага каманда юных геолагаў у 2018 годзе ўдзельнічала ў адкрытай палявой алімпіядзе ў Татарстане, а ў ліпені 2019-га — у першым беларускім рэспубліканскім злёце юных геолагаў, дзе заняла першае месца. У савецкія часы такія злёты праводзіліся часта, і, па словах настаўніцы, вельмі добра, што яны вяртаюцца, бо дапамагаюць набірацца вопыту і новых ведаў.

— Мы стараемся зрабіць усё магчымае, каб прыцягнуць школьнікаў да такой цікавай і важнай навукі, як геалогія. Так, у 2017 годзе сумесна з дэканам факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ распрацавалі праект супрацоўніцтва школы і ВНУ дзеля развіцця дзіцяча-юнацкага геалагічнага руху ў Беларусі. Праект быў удастоены гранта Мінгарвыканкама. У рамках рэалізацыі гэтага праекта ў 2018 годзе адбылася першая інтэрнэт-алімпіяда па геалогіі. Дарэчы, супрацоўнікі факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ і цяпер нам вельмі дапамагаюць. Можна сказаць, што мы супрацоўнічаем і сябруем. Таксама вялікую навуковую падтрымку падчас падрыхтоўкі да алімпіяды нам аказалі супрацоўнікі рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі» і ААТ «Беларуськалій», а матэрыяльную — група кампаній «СОХРА» і ААТ «Рузэкспедыцыя», — адзначыла Жанна Гвозд.



Ужо другі раз беларуская каманда ўваходзіць у тройку лідараў Міжнароднай палявой алімпіяды юных геолагаў.

### АДЗІН — ЗА ЎСІХ, І ЎСЕ — ЗА АДНАГО

Па словах настаўніцы, будучы геолаг абавязкова павінен быць настойлівы, інтэлектуальна развіты, амбіцыйны, сур'ёзны і ў той жа момант з рамантыкай у душы. А яшчэ яму неабходна ўмець працаваць у камандзе.

— Гэтыя дзеці настолькі жывыя, што знойдуць агульную мову з кім заўгодна, але ім і разам ніколі не бывае сумна. Такая згуртаванасць вельмі важна для каманднай гульні, — падкрэсліла Жанна Яўгенаўна. — У любой дзіцячай камандзе абавязкова ёсць яшчэ і бацькі, якія падтрымліваюць сваіх дзяцей, бо калі ўсе не будуць на адной хвалі, то нічога не атрымаецца. Узаемасувязь «дзеці — бацькі — педагогі» працуе ў нас вельмі добра. Калі мы, напрыклад, ездзілі на Пціч, каб папрактыкавацца ў гідралогіі, радыёметрыі, шліхавым апрабаванні і геалагічным маршруце, дзеці амаль цэлы дзень працавалі, а бацькі ў гэты час побач смажылі шашлыкі для ўсіх удзельнікаў вялікай каманды.

Усе ўдзельнікі каманды, як адзін, кажуць, што займацца геалогіяй іх натхніла кіраўніца. Яна «праліла святло на гэту цудоўную навуку». Такі ж прыклад калісьці быў і ў самой Жанны Яўгенаўны.

— Я скончыла педагагічны ўніверсітэт па спецыяльнасці «настаўнік геаграфіі», але ва ўніверсітэце любімым прадметам была геалогія. Яе ў нас выкладаў вельмі вядомы ў Беларусі геолаг Барыс Мікалаевіч Гурскі. Да яго было сорамна прыйсці непадрыхтаваным нават тым, хто не вельмі любіў напружвацца, — расказала настаўніца. — Але пасля вучобы і рэдка сутыкалася з геалогіяй, бо ў школьным курсе яе амаль няма, пакуль мы не вырашылі паўдзельнічаць у гэтай авантуры. І я не шкадую. Думаю, ніхто з юных геолагаў таксама не шкадуе. Я чула, што аднакласнікі спачуваюць дзецям з каманды, таму што летам, падчас канікул, ім давялося ехаць на алімпіяду. Не разумеюць, навошта працаваць на канікулах, калі можна адпачываць. Вядома, гэта складаная і адказная праца — прадстаўляць сваю краіну на мерапрыемстве такога ўзроўню, але ж і які важны вопыт!

Самі ж юныя геолагі пакуль вырашаюць, ці звяжуць сваё жыццё з геалогіяй. Але такія мэтанакіраваныя юнакі і дзяўчаты дакладна даб'юцца поспехаў у любой прафесіі.

**Кацярына КІРЭЕВА.**
**Фота з архіва герояў.**

Экапарады

# Букет для настаўніка

**Першае верасня без кветак — гэта быццам Новы год без ёлкі ці мандарынаў. Згодныя? Насамрэч цяжка ўявіць школьніка, які ідзе да свайго любімага настаўніка з пустымі рукамі. Але за традыцыямі вельмі важна не забыцца і на бяспеку. Бо, на жаль, нават бяскрыўдныя на першы погляд букеты сёння могуць хаваць шмат непрыемных сюрпрызаў. Што тады рабіць? Давайце разбірацца!**



### Цудоўны набор... таксінаў

Памятаю, у дзяцінстве мяне вельмі здзіўляла, чаму кветкі ў краме так доўга жывуць, тады як нашы з агародчыка не могуць прастаяць і дня. Сакрэт аказаўся просты — уся справа ў вялікай колькасці хімікатаў. Спачатку, каб кветкі раслі хутчэй, іх шчодра ўгнойваюць, як вы разумееце, далёка не арганікай, пасля чаго апрацоўваюць біяцыдамі і пестыцыдамі, якія знішчаюць пустазелле, паразітаў і насякомых у цяпліцах. Пасля гэтых працэдур кветкі зразаюць і адразу кансервуюць зноў жа з дапамогай усіх дасягненняў хімічнай прамысловасці, бо інакш яны не змогуць «даляцець» да крамы. І вось мы атрымліваем цудоўны букецік таксінаў. Важна адзначыць, што большая частка кветак прыязджае да нас з краін з нястрогім экалагічным заканадаўствам (напрыклад, Калумбіі, Кеніі, Эфіопіі), дзе да гэтага часу дазволена выкарыстоўваць пестыцыд ДДТ, які лічыцца надзвычай небяспечным і таму забаронены ва ўсіх краінах Еўропы.

**Цікава**

Падчас вырошчвання ўсяго адной кветкі і яе транспарціроўкі выдзяляецца каля трох кілаграмаў вуглякіслага газу.

Трэба таксама памятаць пра транспартны след, які цягнецца за ўсімі гэтымі прывезенымі букетамі, і вялікую колькасць выдаткаваных на іх вырошчванне рэсурсаў (ваду, электраэнергію і г. д.). Напрыклад, толькі для вырошчвання аднаго цюльпана патрэбна каля 13 літраў вады.

### Якая ёсць альтэрнатыва?

Школьнікам вельмі няёмка цягнуць вялізарныя букеты ў школу (па сабе ведаю), а потым стаяць з імі яшчэ і на лінейцы. Не патрэбны яны і настаўнікам, якія проста не ведаюць, куды дзець усю гэту прыгажосць, таму большую частку вельмі хутка адпраўляюць у сметніцу. А бачыць, як твой букет выкідаюць, вельмі непрыемна, асабліва маленькім дзецям. Таму лепш за ўсё падарыць невялікую кветачку ў гаршку, якую можна нават пакінуць у класе. Не падабаецца такі варыянт? Паспрабуйце знайсці кветкі мясцовых вытворцаў, якія вырошчваюць іх без хімікатаў, альбо складзіце прыгожы букет з кветачак са свайго саду. І, вядома, старайцеся выкарыстоўваць упакоўку і іншыя ўпрыгажэнні з натуральных матэрыялаў: паперы, льну, дрэва і лазы.

**Важна!**

Больш за палову супрацоўнікаў кветкавых прадпрыемстваў у Коста-Рыцы маюць сімптомы хранічнага атручвання пестыцыдамі.

А калі ўсё ж вы лічыце, што кветкі з крамы нічым нельга замяніць, шукайце беларускія альбо тыя, што былі прывезены з найбліжэйшых да нас краін. Яны таксама апрацаваны хімікатамі, але ў іх усё ж меншы транспартны след.

Прыемнага вам свята!

**Маша ЗЯЛЁНАЯ.**


Чытайце ў жнівеньскім нумары часопіса «Родная прырода»

✓ Як веласіпедны рух садзейнічае ўстойліваму развіццю гарадоў.

✓ Чаму ў Беларусі ўсё часцей здараюцца засухі?

✓ Раскрываем тайны пчалінай сям'і.

✓ Валерый ДАЙНЭКА: «Дом на беразе ракі — мара рыбака».



## Кніжная паліца

# ФАРБЫ І КОЛЕРЫ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

**Выдавецтва «Беларусь» падрыхтавала чарговы падарунак да Дня беларускага пісьменства ў Слоніме — альбом «Мастацкі вобраз Гродзеншчыны».**

Сёлета, як ніколі, Міністэрства інфармацыі, Гродзенскі аблвыканкам і Слонімскі райвыканкам парупіліся над стварэннем цэлай бібліятэкі кніг, звязаных са святам прыгожага пісьменства, а галоўнае — з гісторыяй і асветніцтвам на Гродзеншчыне, у Слоніме. Назавём хаця б некаторыя творчыя праекты — альбомы старых паштовак пра Гродна і Слонім, фотаальбом, прысвечаны Каложскай царкве, гісторыка-краязнаўчыя кнігі. І вось яшчэ выданне, якое аб'яднала розных майстроў выяўленчага мастацтва багатага на культурныя здабыткі краю.

Пад вокладкай «Мастацкага вобраза Гродзеншчыны» (укладальнікі кнігі — Алена Клімовіч, Мікалай Бандарчук, Юрый Кітурка) сабраны рэпрадукцыі і фотаздымкі, што прадстаўляюць творчасць амаль 80 жывапісцаў, графікаў, скульптараў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ва ўступным слове да альбома старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Уладзімір Краўцоў зазначыў: «Мастакі Гродзеншчыны паспяхова дэманструюць сваю творчасць на самых прэстыжных еўрапейскіх выставачных пляцоўках, прымаюць актыўны ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных пленэрах графікаў, жывапісцаў, скульптараў, а таксама ў культурным жыцці горада і вобласці, выстаўках, конкурсах і фестывалях, робяць значны ўнёсак у эстэтычнае выхаванне насельніцтва сродкамі мастацтва.

Мастацкае жыццё Гродна — гэта творчы лёс і Віктара Шчарбакова (яго «Зімовы Гродна», «Лодкі на Нёмане», напісаныя амаль паўстагоддзя таму, і цяпер вабяць вока), і Уладзімра Церабуна (гэта ён — аўтар мемарыяла ў Дальве, скульптурных кампазіцый «Клёкат буслоў» у Скідзелі, «Дрэва жыцця»), і Мікалая Бандарчука (яго карціна «Каложа» здаецца шырокім вакном у вялікі і бясконцы Сусвет), і Кастуся Качана (кожная з яго работ — адкрыццё роднай Беларусі, радзімазнаўчае падарожжа па адрасах нашай Айчыны)... Альбом уражвае, падштурхоўвае да асэнсавання мастацкай памяці пра краіну ўвогуле, пра ролю выяўленчага мастацтва ў стварэнні і захаванні такой памяці. Было б выдатна, каб кнігі такога кшталту, як «Мастацкі вобраз Гродзеншчыны», з'явіліся і ў іншых рэгіёнах краіны, прадставіўшы такім чынам мастакоў Міншчыны, Гомельшчыны, Віцебшчыны, Берасцейшчыны, Магілёўшчыны.

**Кастусь ХАДЫКА.**

## Пошук

# Проня адкрывае новыя імёны

**На месцы бязлітасных баёў Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі трох раёнаў Магілёўскай вобласці — Чавускага, Бабруйскага і Слаўгарадскага прайшла беларуска-расійская пошукавая экспедыцыя «Проня».**

Каля 40 байцоў магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» разам з пошукавікамі атрада «Світанак» з горада Арзамаса Ніжагародскай вобласці і 52-га пошукавага батальёна Рэспублікі Беларусь праводзілі пошук загінулых у часы вайны герояў. Побач з вёскай Вужжар знойдзены акопы савецкіх салдат, у якіх, на думку пошукавікаў, падчас баёў у 1943 годзе загінула шмат чырвонаармейцаў.

Акрамя астанкаў салдат знойдзены таксама два медалі і фрагмент паштовай квітанцыі. Па квітанцыі атрымалася ўстанавіць, што ўладальнік медаля «За баявыя заслугі» — лейтэнант Сцяпан Аляксеевіч Тапычканаў, 1909 года нараджэння, камандзір роты 330-й стралковай дывізіі, і родам ён з Башкірыі. Лейтэнант загінуў 30 кастрычніка 1943 года і дагэтуль лічыўся зніклым без вестак. Ужо знойдзены і сваякі загінулага. Высвятляецца імя і другога героя, медаль «За адвагу» якога быў знойдзены яшчэ ў адным адзіночным пахаванні каля вёскі Прылепаўка.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!**

Фондом «Гроднооблимущество» проводится аукцион по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района.

К продаже предлагается:

**1. Изолированное помещение ФАП с верандой в Волковысском районе по адресу: д. Красный Груд, 12А-1 Субочского с/с.**

**2. Здание ФАП с принадлежностями (веранда с террасой, уборная, забор, дворовое мощение, сарай) в Волковысском районе по адресу: д. Вехотница, 47, 47/1 Росского с/с.**

Аукцион состоится **19 сентября 2019 г. в 11.30 и 12.00**.

Заявки на участие в аукционах принимаются по адресу: город Гродно, улица 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционах – **13 сентября 2019 г. до 17.00.**

Подробная информация размещена на сайте http://www.region.by, http://www.gki.gov.by.

Справки по телефонам:
в городе Волковыске – (801512) 4 50 25;
в городе Гродно – (80152) 772915, 722518, 72 21 02.

УНП 500007288

**Извещение о проведении электронных торгов**
**5 сентября 2019 года по продаже недвижимого имущества ОАО «ОРС Гомель»**
**СО СНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ СТОИМОСТИ НА 30 %**

| Предмет электронных торгов и его месторасположение | Начальная цена лота, бел. руб. (с НДС 20 %) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1 Капитальное строение** здание магазина № 87, инв. номер 310/С-23744, общая площадь 68,2 кв. м, 1963 г. п., расположенное по адресу: Гомельский р/н., д. Березки, ул. Первомайская, 77а.<br>Назначение – здание специализированное розничной торговли.<br>Согласно техническому паспорту зданию принадлежит:<br>сарай, инв. № 4100252; дощатая уборная, инв. номер № 4100251;<br>забор дощатый сплошной, инв. № 1068726; забор дощатый решетчатый, инв. № 1068727; ворота металлические, инв. № 1068754; навес кирпичный, инв. № 1068756.<br>**Лоту принадлежит оборудование:** система охранной сигнализации, инв. № 346257.<br>**Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 321089200601000313 площадью 0,0405 га (право постоянного пользования), назначение – для размещения объектов розничной торговли | **14 680,51** | **1 468,05** |

**Оператор электронной торговой площадки: РУП «Информационный центр Минэкономики», 220030, г. Минск, ул. Берсона, 1а, комн. 513, torgi.gov.by**

1.Продавец: Открытое акционерное общество «ОРС Гомель», 246014, г. Гомель, ул. Калинина, 14 тел.: 8 (0232) 26-62-04.
2. Электронные торги состоятся 5 сентября 2019 г. на электронной торговой площадке оператора torgi.gov.by.
3. Электронные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608.
4. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, аккредитованное на электронной торговой площадке, подает оператору электронной торговой площадки заявление и документ, подтверждающий внесение суммы задатка.
Сумма задатка перечисляется на текущий расчетный счет BY47BLBB30120400051678001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области г. Гомель, ул. Советская, 7, БИК BLBBBY2X, УНП 400051678.
5. Последний день подачи заявления – 04.09.2019 г.
6. В течение пяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов.
7. После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) названных действий и представления организатору копий платежных документов, но не позднее десяти рабочих дней, с победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями электронных торгов с продавцом заключается договор купли-продажи имущества

**ООО «Центр Белинвентаризация»**
***г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1***

✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

**извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «Хальч» 8 (02330) 3 75 83**

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - капитальное строение (индюшатник) с инв. №311/С-50527 общей площадью 852,3 кв. м. Объект расположен по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, Хальчанский с/с, 7, индюшатник вблизи п. Станки, на земельном участке с кадастровым номером 320886800009000022 площадью 0,2855 га | **24 192,00** | **2 419,20** |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **По 10 сентября 2019 г. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** |
| Дата, время и место проведения аукциона | **12 сентября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266.<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация».<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещения в газете «Звязда» от 27.08.2019 г. |
| Условия продажи | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 30 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Стоимость лота, сформированная на аукционе, должна быть выплачена Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 10 рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на изготовление правоустанавливающих документов в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи в сумме 2881,94 руб. и затраты на организацию и проведение аукциона.<br>Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.05.2019 г. |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел. (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

## ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении 2 октября 2019 года аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Чернинском сельсовете Брестского района

| № лота | Местоположение земельного участка | Площадь, га | Нач. (старт.) стоимость зем. уч., руб. | Целевое назначение земельного участка и его кадастровый № |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **Д. Братылово, пер. Короткий, 1А**<br>**Сумма задатка, руб.;**<br>**расходы:**<br>- изготовление градостроительного паспорта<br>- на изготовление земельно-кадастровой документации<br>- на регистрацию создания земельного участка<br>- на размещение объявлений в средствах массовой информации | 0,1419 га | 8000 руб. 00 коп<br>800 руб. 00 коп.<br>754 руб. 27 коп.<br>696 руб. 80 коп.<br>96 руб. 90 коп.<br>затраты согласно акту выполненных работ | Строительство и обслуживание одноквартирного (блокированного) жилого дома;<br>№ 121285002101000257 |

К земельному участку в д. Братылово. пер. Короткий, 1А имеется возможность подъезда к участку, возможность подключения к линии электропередачи, газопроводу. Участок свободен от застройки.

Аукцион будет проводиться 2 октября 2019 г. в 10.30 по адресу: Брестский район, аг. Черни, ул. Пионерская, 16 (здание Чернинского сельисполкома). Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Чернинского сельисполкома № BY95AKBB36410000003051000000, филиал 100 ОУ АСБ «Беларусбанк» г. Брест, БИК AKBBBY21100, назначение платежа 04901, залога в размере 10 % от начальной цены земельного участка; документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Заявления для участия в аукционе принимаются по адресу: аг. Черни, ул. Пионерская, 16 (здание Чернинского сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений до 17.00 26 сентября 2019 года.

Контактные телефоны: 94-31-35, 94-31-36, 94-31-67.

УНП 200035822

## ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении 2 октября 2019 года аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Чернинском сельсовете Брестского района

| № лота | Местоположение земельного участка | Площадь, га | Нач. (старт.) стоимость зем. уч., руб. | Целевое назначение земельного участка и его кадастровый № |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **Д. Братылово, пер. Короткий, 1**<br>**Сумма задатка, руб.;**<br>**расходы:**<br>- изготовление градостроительного паспорта<br>- на изготовление земельно-кадастровой документации<br>- на регистрацию создания земельного участка<br>- на размещение объявлений в средствах массовой информации | 0,1410 га | 8000 руб. 00 коп<br>800 руб. 00 коп.<br>753 руб. 92 коп.<br>696 руб. 80 коп.<br>96 руб. 90 коп.<br>затраты согласно акту выполненных работ | Строительство и обслуживание одноквартирного (блокированного) жилого дома;<br>№ 121285002101000256 |

К земельному участку в д. Братылово. пер. Короткий, 1 имеется возможность подъезда к участку, возможность подключения к линии электропередачи, газопроводу. Участок свободен от застройки.

Аукцион будет проводиться 2 октября 2019 г. в 10 часов по адресу: Брестский район, аг. Черни, ул. Пионерская, 16 (здание Чернинского сельисполкома). Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Чернинского сельисполкома № BY95AKBB36410000003051000000, филиал 100 ОУ АСБ «Беларусбанк» г. Брест, БИК AKBBBY21100, назначение платежа 04901, залога в размере 10 % от начальной цены земельного участка; документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Заявления для участия в аукционе принимаются по адресу: аг. Черни, ул. Пионерская, 16 (здание Чернинского сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений до 17.00 26 сентября 2019 года.

Контактные телефоны: 94-31-35, 94-31-36, 94-31-67.

УНП 200035822

## ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении 2 октября 2019 года аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Чернинском сельсовете Брестского района

| № лота | Местоположение земельного участка | Площадь, га | Нач. (старт.) стоимость зем. уч., руб. | Целевое назначение земельного участка и его кадастровый № |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **Аг. Черни, ул. Полевая, 6**<br>**Сумма задатка, руб.;**<br>**расходы:**<br>- изготовление градостроительного паспорта<br>- на изготовление земельно-кадастровой документации<br>- на регистрацию создания земельного участка<br>- на размещение объявлений в средствах массовой информации | 0,1065 га | 17000,00<br>1700,00<br>837,95<br>1017,48<br>78,40<br>затраты согласно акту выполненных работ | Строительство и обслуживание одноквартирного (блокированного) жилого дома;<br>№ 121285008601001234 |

К земельному участку в аг. Черни, Полевая, 6 имеется возможность подъезда к участку, возможность подключения к линии электропередачи, газопроводу, водопроводу, канализации. Участок свободен от застройки.

Аукцион будет проводиться 2 октября 2019 г. в 11 часов по адресу: Брестский район, аг. Черни, ул. Пионерская, 16 (здание Чернинского сельисполкома). Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Чернинского сельисполкома № BY95AKBB36410000003051000000, филиал 100 ОУ АСБ «Беларусбанк» г. Брест, БИК AKBBBY21100, назначение платежа 04901, залога в размере 10 % от начальной цены земельного участка; документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Заявления для участия в аукционе принимаются по адресу: аг. Черни, ул. Пионерская, 16 (здание Чернинского сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений до 17.00 26 сентября 2019 года.

Контактные телефоны: 94-31-35, 94-31-36, 94-31-67.

УНП 200035822

# ТАЯМНІЦЫ ПАРКАВЫХ ПРЫСАДАЎ...

**Яна МАРЧУК — ландшафтны дызайнер. Яна мае дыплом інжынера садова-паркавага будаўніцтва Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта, акрамя таго, скончыла магістратуру ў Вялікабрытаніі па спецыяльнасці «Рэстаўрацыя гістарычных паркаў і культурных краявідаў». Трэба адзначыць, гэта хіба што адзіны спецыяліст з такой адукацыяй у нашай краіне. Таму мы пагутарылі з Янай Марчук пра тое, дзе схавана сэрца старога парку і як можна яго ўбачыць, а таксама пра «зялёную» атмасферу вялікага горада.**



***— На твой погляд, ці сапраўды Беларусь — зялёная краіна?***

— Найперш, хачу нагадаць, што краявід — гэта не толькі расліны. Гэта складанае паняцце пра месца, якое ўключае ў сябе як фізічныя элементы (глеба, рэльеф, паветра, вада, расліны, жывёлы, пабудовы і паселішчы) і працэсы, так і яго гісторыю, адлюстраванне ў культуры і нашае ўспрыняцце.

Цяпер да пытання пра «зялёную краіну». Калі я не памыляюся, пад гэтым звычайна разумеюць лясістасць і колькасць «зялёных» тэрыторый у паселішчах.

Па ступені пакрытасці лесам Беларусь асабліва не выдзяляецца ні сярод краін умеранага пояса, ні ў Еўропе. Лясы займаюць каля 40 % нашай плошчы, таксама, як у Нарвегіі, Славакіі і Францыі, і крыху больш, чым у Германіі, ЗША і Канадзе. У Еўропе сярэдняя лясістасць — прыблізна 50 %, а найбагацейшыя лесам еўрапейскія краіны — Фінляндыя і Швецыя (каля 70 %).

Што да «зялёнасці» гарадоў, то яна магла б быць нашмат большая. Раслін дужа не хапае на шырокіх вуліцах і ў жылых дварах. У цэнтрах нашых гарадоў — усцяж брук і адкрытыя газоны, а значыць, спёка і пыл. Паркаў і сквераў нібыта нямала, але не паўсюль зручна праводзіць час, бо ўсё яшчэ не хапае прадуманай якаснай інфраструктуры.

***— Ты рабіла даследаванне, прысвечанае парку каля Любчанскага замка. Ці складана займацца такім вывучэннем?***

— Так, вывучэнне гістарычнага парку — доўгая і карпатлівая праца. У так званых комплексных навуковых даследаваннях удзельнічае мноства спецыялістаў: гісторыкі, ландшафтныя архітэктары, археолагі, гідролагі, эколагі, батанікі, фітапатолагі. А калі ў парку выяўляюць каштоўныя віды жывёл, грыбоў або лішайнікаў, то іх больш пільна вывучаюць адпаведныя спецыялісты і таксама даюць свае заключэнні і рэкамендацыі.

Рэстаўратары гістарычных паркаў (звычайна гэта ландшафтныя архітэктары з кваліфікацыяй у рэстаўрацыі) адказныя за прыняцце праектных рашэнняў. Для гэтага яны дасканала вывучаюць усе матэрыялы — гістарычныя і натурныя — і вызначаюць на іх падставе каштоўнасць парку. Гэта складаная, але і надзвычай цікавая задача.

Сваё даследаванне Любчанскага парку я рабіла ў межах дыпломнага праекта. Я вывучала рэшткі планіроўкі, блізкія і далёкія віды, дрэвавыя і травяністыя расліны, састаў глебы. Асноўнымі гістарычнымі крыніцамі былі працы знакамітага даследчыка беларускіх сядзіб Анатоля Федарука і гістарычная даведка Святланы Адамовіч.

Я спрабавала знайсці інфармацыю аб парку таксама ў архівах у Гродне і Мінску, але без поспеху. Пазней у замежным архіве гісторыкі выявілі фотаздымкі кветкавага партэра ў Любчанскім парку і дыхтоўнай драўлянай лесвіцы, якая вяла да яго з замчышча.



Стары парк у Нясвіжы. Фота А. Крука, mapio.net

Дарэчы, гэтая знаходка чарговы раз паказала, што насамрэч звесткі пра нашыя паркі захаваліся, але яны рассыпаныя па розных мясцінах свету. Сабраць архівы — доўгая і дарагая праца, але без яе не абысціся, калі мы хочам сапраўды захоўваць і аднаўляць сваю спадчыну.

Мяне захапляла чытанне ўспамінаў нашчадкаў апошніх уладальнікаў Любчанскага замка і сядзібы. Месца, на якое спачатку глядзіш толькі як на архітэктурны і гістарычны аб'ект, пачынае «ажываць»: ты знаёмішся з людзьмі, якія яго асвойвалі, змянялі і развівалі, даведваешся пра іх густы, характары, лад жыцця. Гісторыя месца набывае дадатковае вымярэнне — чалавечую індывідуальнасць.

Нам пакуль дакладна не вядома, як выглядаў Любчанскі парк, таму рана казаць пра яго аднаўленне. Цяпер важна захаваць тое, што да нас дайшло. Асаблівага клопату патрабуе шэры арэх, які мае не менш за 100 гадоў і які, паводле Анатоля Федарука, з'яўляецца найстарэйшым у Беларусі.

***— Якія паркі нашай краіны ты раіш наведаць?***

— Вядома, Нясвіжскія замкавыя паркі. Таксама варта прагуляцца па Альбе — некалі вялізным паркавым ансамблі. У ім захаваліся рэшткі цікавай воднай сістэмы ў выглядзе каналаў, якія радыяльна адыходзяць ад выспы, а таксама нямала старых дрэў.

Вельмі маляўнічы парк у Лагойску: ён уладкаваны на старажытных умацаваннях гарадзішча, а пазней — замка. Падобна як і парк у Высокім, які ўключыў у сваю кампазіцыю рэшткі замка Сапег. У Высокім яшчэ чытаецца адметная алея з конскага каштана, якая мае даўжыню 400 метраў і з'яўляецца адной з самых доўгіх паркавых алей у Беларусі.

Таксама параю паглядзець парк «Манькавічы» на ўскраіне Століна, які захаваў шмат цікавых экзотаў і цяпер мае статус помніка прыроды рэспубліканскага значэння.

***— Колькі ў Беларусі наогул гістарычных паркаў?***

— Іх не менш за тысячу. Цяпер абсалютная большасць з іх у кепскім і вельмі кепскім стане: планіроўка і віды страчаныя, як і большасць старых дрэў, вадаёмы зарастаюць і перасыхаюць. Тым не менш многія паркі яшчэ захоўваюць асаблівую атмасферу. Але ехаць да іх трэба падрыхтаванымі, прачытаць усё, што знойдзецца, каб здолець пабачыць у паркавых руінах рэшткі алеі, разрозніць тэрасы, заўважыць у зарасцях групу ліп, якія калісьці былі зялёнай альтанкай, а ў шэрагу грабаў пазнаць стрыжаную ў мінулым шпалеру.

Здараюцца і адкрыцці. Парк сядзібы Савейкі, што ў Ляхавіцкім раёне Брэсцкай вобласці, уразіў мяне захаванасцю сваёй прасторы. Яна не парушаная недарэчнымі збудаваннямі, ручаі і сажалкі паўнаводныя, травяное покрыва багатае, дарожкі не зараслія. Пашанцавала таксама, што ў гэтай сядзібе дастаткова добра захаваўся дом і гаспадарчыя пабудовы. Савейкі — дужа перспектыўнае месца.

***— Ці ёсць у Беларусі прыклады добра рэстаўраваных паркаў?***

— Стары парк каля Нясвіжскага замка аднаўлены, агулам, прыстойна: насаджэнні, пакрыццё дарожак, масткі і мэбля арганічна выглядаюць у гістарычнай прасторы, не псуюць яе ўспрыняцце. Прыклад якаснай рэстаўрацыі ёсць у Станькаве, дзе ратонда, прыстань і масток аднаўленыя паводле гістарычных матэрыялаў. Цешаць дарожкі з каменных высевак у парку ў Высокім.

***— Многія старыя будынкі страчаны для сучаснасці, але ёсць шмат паркаў, якія пра іх нагадваюць, ці не так?***

— У кожнай, нават самай сціплай шляхецкай сядзібе быў парк, няхай толькі ў выглядзе алей, якія акалялі пладовыя сады. Цяпер нярэдка парк (а дакладней, яго рэшткі) — ледзьве не адзіны ацалелы элемент шляхецкай сядзібы. У савецкі час панскія дамы як сімвалы варожага класа, знішчалі або перабудоўвалі да непазнавальнасці. Гаспадарчыя будынкі разбіралі на цэглу або яны проста згнівалі без догляду. Да паркаў, відаць, такой нянавісці, як да шляхецкіх дамоў, не было: напэўна, таму, што да «зеляніны» агулам ставіліся станоўча. Але і клопату не было: у парках высякалі каштоўныя дрэвы, ладзілі сіласныя ямы, смецілі, бяздумна змянялі водны рэжым, ад чаго сажалкі і ручаі зарасталі і перасыхалі. Але, нягледзячы на сур'ёзны занепад, большасць паркаў захавалі прынамсі свае межы, адзінкавыя старыя дрэвы, а таксама самасеў, які магчыма выкарыстаць у іх аднаўленні.

Мы часта не звяртаем увагі, а прысада каля дарогі, якая вяла да шляхецкага маёнтка, была часткай яго кампазіцыі. Яна аздабляла шлях і стварала ўрачыстае пачуццё, рыхтуючы гасцей да сустрэчы з панскім домам. Найчасцей высаджвалі ліпу, клён, ясень. Думаю, што прысады абавязкова трэба захоўваць, нават калі сама сядзіба не захавалася. І паклапаціцца пра тое варта ў тым ліку сельскім Саветам, на тэрыторыі якіх яны знаходзяцца.

***— Ты звязала сваё жыццё з ландшафтным дызайнам і даследаваннем паркаў. Ці адчуваеш задавальненне ад абранай справы?***

— Часам адчуваю вялікае задавальненне: калі бачу прыгажосць, а яшчэ — калі паглыбляюся ў вывучэнне месца.



Арэх шэры ў парку ў Любчы, 2013 год.

Гістарычныя паркі мне асабліва цікавыя тым, што спалучаюць у сабе прыродныя і культурныя складнікі. На адным баку — прырода са сваімі сіламі і непазбежнымі працэсамі, а на іншым — чалавек, які імкнецца рэалізаваць прыдуманы ім план. І вось, калі маеш справу з гістарычным аб'ектам, заўсёды вельмі цікава вывучаць яго з двух пунктаў. З аднаго боку, гэта жывы арганізм, у якім за час, вольны ад рук чалавека, сфарміравалася пэўная экасістэма: або, прыкладам, дужа маляўнічае месца з самасеўных дрэваў і хмызнякоў, або кветкавыя расліны «збеглі» з клумбы і сталі арганічнай часткай паркавага травяного покрыва. З другога боку, цікава дазнавацца, як парк выглядаў у розныя часы, якія былі ідэі ў яго стваральнікаў, якое значэнне гэтае месца мела і мае для людзей на працягу ўсяго свайго існавання. Ты супастаўляеш усё, пра што атрымалася даведацца (і ўсё, што не ведаеш), шукаеш найлепшыя рашэнні. Гэтая праца складаная, але захапляльная.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота з архіваў гераіні матэрыялу.**



Ратонда ў Станькаўскім парку (Дзяржынскі раён), 2016 год.
Фота В. Пісарэўскага, pisarevskij.com



Парк у Савейках, 2017 год.

## Рабін г. Бабруйска Шауль ХАБАБА:

# «Чалавек жыве ў гэтым свеце не для сябе»

**На пачатку жніўня па вуліцы Чангарскай, 31, што ў Бабруйску, адчыніўся яўрэйскі дворык. На гэту падзею з'ехаліся госці з усяго свету — прыбыло каля 50 чалавек. Цяпер дворык можа наведваць кожны ахвотны ў любы час, акрамя начнога. Сцяна старой сінагогі, якая змяшчаецца ў дворыку, акуратна дапоўнена сучаснай чырвонай цэглай — так, што кладка амаль не адрозніваецца. Колішнія праёмы акон пакрытыя белай тынкоўкай, на якой змешчаны вялікія прыгожыя малюнкі, што сведчаць пра розныя аспекты жыцця народа — традыцыйную вопратку, адукацыю, побыт.**

**Карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з рабінам Бабруйска Шаулем Хабаба. Яму ўсяго 33 гады. А ў Бабруйск з Ізраіля ён прыехаў, калі яму было 19 — усяго праз год пасля заснавання ў Ізраілі ўласнай рэкламнай кампаніі. У 22 гады Шауль Хабаба стаў бабруйскім рабінам.**



Рабін Шауль гасцінна запрасіў унутр.

— У мяне было шмат розных прапаноў — запрашалі ў Кіеў, Санкт-Пецярбург ды іншыя месцы. Чамусьці я выбраў менавіта Бабруйск — і не пашкадаваў пра гэта.

**— У горадзе шмат грамадскіх згуртаванняў яўрэяў...**

— Так, іх шэсць — усе супрацоўнічаюць між сабой, многае робяць сумесна. Усе святы мы адзначаем супольна. А работу падзялілі паміж згуртаваннямі — таму не канкурыруем, а, наадварот, падтрымліваем. Людзі сталага веку збіраюцца адно з адным, моладзь — з моладдзю, дзеці — таксама разам. Для кожнага ёсць варыянт, як спазнаць хоць невялікі кавалак іўдаізму праз шлях, які яму больш блізкі.

**— Ваша супольнасць збіраецца ў старым, прыгожым будынку. Раскажыце яго гісторыю.**

— Тут раней размяшчалася ешыва — рэлігійная навучальная ўстанова. Адсюль паходзіў знакаміты рабін Шмар'яў-Наах Шнеерсон — ён памёр дзесьці ў 1923 годзе і пахаваны на мясцовых яўрэйскіх могілках. Ён быў вялікім чалавекам і мог аб'яднаць вялікую частку яўрэяў, якія жылі ў Бабруйску ў той час, а яны складалі каля 80 % насельніцтва горада. Фактычна гэта было яго ешыва, яго вучэльня, дзе ён выхоўваў будучае пакаленне. І адсюль выйшла шмат знакамітых людзей, ва ўсякім разе па ізраільскіх мерках. Дагэтуль на самай вялікай у Ізраілі купюры, 200 шэкеляў (прыблізна 100 рублёў), выяўлены Натан Альтэрман. Гэта вядомы пісьменнік, паэт — яго бацька нарадзіўся недалёка ад Бабруйска, каля Буда-Кашалёва. Вельмі шмат вядомых асоб, калі капнуць іх біяграфію, паходзяць з Бабруйска ці ваколіц, вучыліся тут. Сучасную сінагогу агулам наведвае каля 750 чалавек — як тых, хто прыходзіць раз на год, так і тых, хто наведвае штодзённую службу.

**— Ці сябруеце з бабруйчанамі, якія не з'яўляюцца яўрэямі?**

— Гэта цікавае пытанне. У Бабруйску не яўрэяў не бывае. У наш дворык, на Чангарскай, толькі што завітвалі мясцовыя, беларусы, — яны прынеслі і высадзілі там кветкі. Не толькі найбліжэйшыя суседзі, але і людзі з суседніх раёнаў прыходзілі са скрынкамі кветак і дапамагалі іх пасадзіць, дапамагаюць іх паліваць. Мы рэгулярна атрымліваем добрыя водгукі ад бабруйчан, і гэта надзвычай прыемна — ці то артыкулы чытаем, ці нейкія каментары бачым. Натуральна, заўсёды знаходзяцца тыя, хто імкнецца адшукаць нешта дрэннае, але большасць настроена пазітыўна. Нельга судзіць народ па меншасці, трэба глядзець на большасць — і гэта цудоўныя людзі, сапраўднае свята! Прыемна ісці па вуліцы, вітацца з месцічамі, яны настроены станоўча. У нас добрае супрацоўніцтва з насельніцтвам і з уладамі. У любой сферы, якой займаецца грамада, мы бачым падтрымку.

**— Раскажыце пра дворык, які адкрыўся на Чангарскай.**

— Там калісьці дзейнічала сінагога. Розныя крыніцы па-рознаму тлумачаць яе разбурэнне. Сённяшняя сінагога знаходзіцца зусім побач, на адлегласці менш чым квартал. У нас з'явілася магчымасць узяць гэты аб'ект, які быў у аварыйным стане, і адрамантаваць яго. Па-першае, мы ўшаноўваем яго як колішнюю малельню — людзі могуць азнаёміцца там з традыцыямі, не заходзячы ў сінагогу, не будучы нікому нічым абавязаны. Гэты будынак мог быць разбураны, аднак у нашай традыцыі нельга знішчаць старыя сінагогі — калі толькі не збіраешся будаваць на ёе месцы новую, лепшую. Таму трэба было прымаць пэўнае рашэнне, і мы прыдумалі зрабіць там яўрэйскі дворык. Каб любы бабруйчанін і госць горада мог прыйсці і добра сябе ў ім адчуваць.

**— Каго запрашаем на адкрыццё дворыка?**

— Да нас з'ехалася каля 50 чалавек з Ізраіля, Канады, ЗША, Вялікабрытаніі, ехалі спецыяльна на адкрыццё. Я ўпэўнены, што гэты першы за 35 гадоў раз, калі яны вярнуліся ў Беларусь (не былі тут з таго моманту, як з'ехалі), разбудзіць іх «апетыт» зноў прыязджаць у Беларусь. Завітваць у госці, дакранацца да сцен, побач з якімі яны гулялі ў дзяцінстве, сустракацца з цікавымі людзьмі, якія чакаюць іх тут.

**— Цікава, як бы вы апісалі гэты «апетыт» прыязджаць у Беларусь?**

— У людзей ёсць свае «народныя» густы. Ёсць людзі, з якімі яны выраслі, і месцы, дзе жылі, але яны не ведаюць, які там цяпер стан... Я прыйшоў са свету бізнесу (і цяпер жыву ў ім), дзе трэба рызыкаваць, скакаць у невядомае, не ведаючы, паспяхова гэта будзе ці не. Аднак ты ўпэўнены, што зробіш правільны крок. Людзі, якія прыязджаюць сюды цяпер, пакуль не ведаюць, куды яны трапяць, некаторыя запытваюцца, ці нармальна тут працуе электрычнасць. Нягледзячы на тое, што некаторыя з іх пастаянна ў сецівеве сочаць за навінамі ў Бабруйску, ім трэба прыехаць, каб зразумець, што гэта за месца. Мы вазілі іх па розных кропках Бабруйска, каб паказаць розны горад, — насамрэч па ім прыемна нават проста прайсці. Таксама яны ўбачылі будынкі, у якіх нарадзіліся, выраслі, тыя школы, у якіх вучыліся, дошкі гонару з імёнамі і фотакарткамі найлепшых вучняў. Я ўпэўнены, гэта аднавіла іх жаданне прыязджаць у Беларусь. Тут шмат натуральных прадуктаў (чаго не хапае ў свеце). Я часта бываю за мяжой і сам ведаю, што там зусім не тыя прадукты, не тое паветра. У нас у Беларусі вельмі ашчадна ставяцца да прыроды, а прырода аднаўляе сілы чалавека.

**— Атрымліваецца, вы пакінулі бізнес, каб стаць рабінам?**

— Так, натуральна. Аднак я яго не кінуў. З гэтага бізнесу я і жыву сёння — я не жыву на грошы грамады, наадварот, я ёй дапамагаю. У Ізраілі ў мяне свае рэкламнае агенцтва, у якім працуе 35 чалавек. У 18 гадоў я адкрыў маленькае агенцтва — з таго часу яно вырасла ў агромністую арганізацыю.

**— Як вы зразумелі, што вам трэба ўсё кінуць і прыехаць у Беларусь?**

— У пэўны момант, калі мой бізнес стаў на ногі, я зразумеў, што чалавек жыве ў гэтым свеце не для сябе. Калі жыць толькі для сябе, станеш эгаістам і будзеш нікому не патрэбны. Можна зарабляць шмат грошай, але быць нікому не патрэбным. Так, зарабляць трэба, асабліва калі Бог дае табе такую магчымасць, і трэба дзяліцца з некім. У пэўны момант я ўбачыў, што работа ў агенцтве ідзе вельмі ладна, падумаў: «Навошта я там патрэбны?» У гэтай кампаніі я маю акцыі, з якіх атрымліваю прыбытак, — на іх мне добра жывецца тут. Я там не вельмі патрэбны, а тут, мне здаецца, прыношу пэўную карысць для грамады, для сябе, для людзей, якія таксама мяне чамусьці вучаць. Узаемаабмен — надзвычай карысная рэч.

**— Вы вучыліся і на рабіна, і на рэкламшчыка?**

— Не, я вучыўся толькі на рабіна. А рэклама — гэта проста падарунак мне ад Бога: я ёй нідзе не вучыўся. У студэнцкія часы, паралельна з духоўнай вучобай, я пачаў гэты рух. Спачатку, у 12 гадоў, усё было проста валанцёрствам. На хлеб мне зарабляць не трэба было, сям'я ў нас дастаткова забяспечаная: мама — кандыдат навук, тата — вялікі чалавек у Ізраілі. Таму я распачаў гэты занятак не таму, што меў патрэбу, а таму, што бачыў прыклад сваіх бацькоў — трэба займацца, трэба штосьці рабіць, падпрацоўваць, імкнуцца нешта добрае зрабіць у гэтым свеце. Першай у мяне была рэклама кавы, якую я распрацаваў для вялікай кампаніі ў Ізраілі. Гэта рэклама добра пайшла, на яе атрымаўся вялікі попыт. Я падумаў, што калі першае пайшло добра, то трэба паспрабаваць і другое. Наступнай зрабіў рэкламу для кампаніі мабільных тэлефонаў. На сённяшні дзень мы трымаем даволі вялікі рынак без майго знаходжання ў краіне. Калі трэба, Бог узмацняе гэту сферу, а калі трэба, узмацняе іншае — маю сям'ю, служэнне як рабіна: усё распісана вельмі слушна.

**— Наколькі складана было з'ехаць з Ізраіля ў іншую краіну? І што аказалася самым няпростым тут?**

— Натуральна, складана з'язджаць са свайго дома, пакідаць камфорт, да якога ты прызвычаіўся. Тут жа няпроста было прыстасавацца да іншага менталітэту, а асабліва да іншай мовы. Аднак калі ў цябе ёсць мэта, у правільнасці якой ты ўпэўнены, усё атрымліваецца прыемна і добра.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота аўтара.**
*г. Бабруйск.*

---

ПАНТЭОН АЙЧЫНЫ

# Казімір Лышчынскі

*(1634—1689)*



Казіміра Лышчынскага пакаралі за вольналюбства, за тое, што ўсумніўся ў традыцыйных ісцінах. Ён адвергнуў Бога, а значыць, замахнуўся на манапольную ўладу царквы над душамі людзей, і царкоўнікі не даравалі яму. Суд над ім быў судом над свабоднай думкай.

Яшчэ ў гады навучання ў езуіцкім касцёле ў Бярэсці ў Казіміра прачнуўся дапытлівы розум, хацелася разабрацца з пытаннямі, «што ставяцца ўсімі», хацелася ведаць больш, чым яго вучылі. Гэтая цяга да ведаў прымусіла шляхціца-воіна змяніць свой лёс — і замест вайсковай службы ён у 1658 годзе вярнуўся да вучобы, цяпер ужо ў Кракаўскім езуіцкім калегіуме, прыняўшы манаства. Пасля заканчэння вучобы ён быў памочнікам рэктара езуіцкага калегіума ў Бярэсці. У 1666 годзе Лышчынскі пакідае ордэн езуітаў і вяртаецца ў родавы маёнтак Лышчыцы, атрыманы ў спадчыну ад бацькоў. У спакойнай абстаноўцы Лышчынскі паглыбіўся ў вывучэнне кніг, шукаючы ў іх пацверджання сваіх смелых думак. На заўвагах на іх старонках можна ўбачыць ход разваг: «Мы, атэісты, так думаем», «Значыць, я паказваю, што Бога няма».

Гэтак ён збіраў чужыя меркаванні, асэнсоўваў іх, думаў і пісаў уласны трактат пад красамоўнай назвай — «Аб неіснаванні Бога». Казімір так і не абнародаваў трактат, асцерагаючыся расправы, і ніхто апроч суровых суддзяў не чытаў яго.

З «Трактата» вынікала, што Бога прыдумалі людзі. «Рэлігія створана людзьмі без рэлігіі. Богабоязь выдумалі людзі, каб ім пакланяліся як Богу. Боязь перад Богам намоўлена тымі, хто яго не баіцца, каб іх баяліся. Вера, пра якую кажуць, што яна ад Бога, з'яўляецца чалавечай гісторыяй». Сваім трактатам Лышчынскі аднімаў у царкоўнікаў уладу над чалавечай душой і сумленнем. Ён наўпрост піша: «Ілжэмудрацы падманваюць просты народ, адпужваючы яго ілжывай верай у Бога, і падтрымліваюць яе такім чынам, што нават калі б мудрацы захацелі вызваліць народ з дапамогай праўды ад гэтага прыгнёту, дык мудрацоў душаць з дапамогай самога ж народа». Ён хацеў, як утапіст, «мець свет без улады, гарады без начальнікаў, народ без валадароў».

Лышчынскі адкрыў школу для выкладання сваіх вольных ідэй, выказваў іх у 1687 годзе на берасцейскім сойміку. Прысутны жахнуліся. Царква пачала паляванне на вальнадумца. Сусед Лышчынскага, не жадаючы вярнуць яму пазыку, выкраў трактат і перадаў яго віленскаму біскупу Казіміру Бжастоўскаму. Па просьбе біскупа кароль Ян III Сабескі загадаў узяць вальнадумца пад варту. Царкоўны суд вынес жорсткі прысуд — спаліць бязбожніка. Аднак за яго заступілася берасцейская шляхта, і вышэйшы суд — Трыбунал ВКЛ — адмяніў біскупскі прысуд. Толькі царква не адступіла. Супраць Лышчынскага склалася змова каталіцкіх біскупаў на чале з польскім прымасам. Пад іх ціскам кароль даў згоду разгледзець справу Лышчынскага на Варшаўскім сойме. Судзіў Лышчынскага соймавы суд. З абвінавачваннем супраць яго выступіў езуіт Шымон Куровіч. «Я абвінавачваю яго ў тым, што ён адважыўся на 265 старонках не толькі паказваць Пана Бога як няіснае стварэнне фантазіі, сляпую выпадковасць і скінуць яго з надзвычайнай і недасягальнай вышыні, але і асмеліўся прыпісаць уладу і кіраванне зямлёй і небам натуральнай прыродзе; самога ж пана Бога назваў выдумкай, пачварай, пустой свяціцаю, чалавечым стварэннем, існасцю, створанай у марах, не маючай быцця, а тых, хто верыць у Бога, назваў рабамі бажаства, ідалапаклоннікамі, стваральнікамі Бога; настаўнікаў жа святой каталіцкай веры, багасловаў — рамеснікамі пустаслоўства, паўзунамі, невідушчымі, абаронцамі бязглудзіцы, памылак, састарэлых хітрыкаў. Ён бязбожна абражаў іх, пяром самога д'ябла пісаў бясконцыя блюзнерствы супраць Найсвяцейшай Тройцы, Божага ўвасаблення, паўстання з мёртвых...

Ён вінны больш, чым у бацьказабойстве, бо забіў агульнага айца неба і зямлі, з-за чаго здрыганулася сама смерць, прызначаная для выкуплення чалавечых грахоў Богам...» Закончыў сваё абвінавачванне Куровіч заклікам пакараць Лышчынскага смерцю.

Лышчынскі спакойна выслухаў абвінавачванне, стрываў і знявагі прысутных, і заклікі пакараць «гэтую жахлівую пачвару». Яму заставалася мужна і стойка бараніць калі не жыццё (пэўна, разумеў сваю асуджанасць), дык свой гонар і годнасць, каб не выглядаць «гідкім чалавекам або вырадкам». Толькі тры чалавекі выступілі ў абарону Казіміра Лышчынскага, але яны не маглі выратаваць яго. Выпрабаванне на дэмакратыю шляхта не вытрымала, не абараніла свайго шляхціца ад інквізіцыі царкоўнікаў.

Перад пакараннем Казіміра Лышчынскага яшчэ месяц трымалі ў вязніцы, дамагаючыся ад яго адрачэння. Важна было не толькі знішчыць мысліцеля, але і забіць яго ідэю. Пакаралі мысліцеля 30 сакавіка 1689 года на Старым рынку ў Варшаве на вачах шматлюднага натоўпу. Распаленымі шчыпцамі ў яго вырвалі язык і вусны, а пасля спалілі на вогнішчы. Попел паклалі ў снарад і выстралілі з гарматы ў «Тартарыю». Ягоныя каты лічылі, што разам з прахам згіне назаўжды і імя вальнадумцы, і яго ідэі спазнання света — ды пралічыліся.

## Результаты рекламной игры «Авто от Мастеркард. Июль»

**Организатор рекламной игры:** ЗАО «Сэлмон-Графикс», юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, комн. 43, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

**Рекламная игра называется «Авто от Мастеркард. Июль».**

Срок проведения рекламной игры: в период с 1 июля по 28 августа 2019 года (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

Территория проведения рекламной игры: автозаправочные станции предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть», находящихся в Республике Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3587 от 21.06.2019 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 21 июня 2019 г.

В рекламной игре приняло участие 130 376 физических лиц.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победитель рекламной игры «Авто от Мастеркард. Июль»

Главный приз №1 – Автомобиль Volkswagen Polo, № кузова XW8ZZZ61ZKG056477 и денежные средства для уплаты налога в размере 3 477,00 (три тысячи четыреста семьдесят семь белорусских рублей 00 копеек).

| № п/п | № Шанса | Номер карты | ФИО победителя | Населенный пункт |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 96 229 | 2000008405232 | Пристромов Виталий Валерьевич | Гомель |

Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры: (МТС – 033, Velcom – 029, Life – 025) 6 431 431, круглосуточно

## ООО «Электронная торговая площадка», организатор торгов по продаже имущества ОАО «БАРАНОВИЧИГАЗСТРОЙ», объявляет о проведении 27.09.2019 г. с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке e-torgi.by электронных публичных торгов в форме аукциона

Предмет торгов:

Лот 1. Погрузчик фронтальный XCMG LW 300FN, 2014 г. в. Начальная стоимость 56 000 бел. руб. с НДС;

Лот 2. Погрузчик-экскаватор CASE 695 ST, 2012 г. в. Начальная стоимость 93 800 бел. руб. с НДС;

Лот 3. Гусеничный экскаватор JCB JS290LC Citymaster Super, 2014 г. в. Начальная стоимость 128 200 бел. руб. с НДС;

Лот 4. Экскаватор-погрузчик JCB 4CX Citymaster Super, 2008 г. в. Начальная стоимость 83 600 бел. руб. с НДС;

Лот 5. Экскаватор-погрузчик JCB 4CX Citymaster Super, 2010 г. в. Начальная стоимость 89 300 бел. руб. с НДС;

Лот 6. Автобус ПАЗ 32 053, 2012 г. в. Начальная стоимость 12 100 бел. руб. с НДС;

Лот 7. Автобус ПАЗ 32 053, 2013 г. в. Начальная стоимость 12 800 бел. руб. с НДС;

Лот 8. Автобус ПАЗ 32 053, 2011 г. в. Начальная стоимость 11 300 бел. руб. с НДС4

Лот 9. Автомобиль Ford Transit, цвет серый, 2012 г. в. Начальная стоимость 17 800 бел. руб. с НДС;

Лот 10. Автомобиль Iveco Daily 35C12, 2008 г. в. Начальная стоимость 21500 бел. руб. с НДС;

Лот 11. Автомобиль Lexus LX450 D, 2015 г. в. Начальная стоимость 104500 бел. руб. с НДС;

Лот 12. Автомобиль Ford Transit, цвет темн-серый металлик, 2008 г. в. Начальная стоимость 17 800 бел. руб. с НДС.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296855155.

Место нахождения предмета торгов: г. Барановичи, 2-й пер. Вильчковского, 42; г. Барановичи, ул. С. Лазо, 4.

Сумма шага аукциона: размер первого шага – 5 % от начальной стоимости предмета торгов, размер второго и каждого последующего шага – 1 % от начальной стоимости предмета торгов.

Продавец: ОАО «БАРАНОВИЧИГАЗСТРОЙ».

Организатор торгов: ООО «Электронная торговая площадка», 220090, г. Минск, ул. Полиграфическая, 31-8; +375296855155; contact@e-torgi.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее 20.09.2019 г. на р/с BY51 UNBS 3012 0400 8110 1001 0933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193284725, получатель – ООО «Электронная торговая площадка». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 27.08.2019 по 17.00 26.09.2019 на ЭТП e-torgi.by.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Стоимость возмещаемых затрат на проведение торгов: аукционный сбор в размере 3 % от конечной цены предмета торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Подписание договора купли-продажи – в течение семи дней со дня проведения торгов. Оплата по договору купли-продажи в течение тридцати дней со дня проведения торгов.

## Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!

## Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района:

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЮТСЯ:

1. Комплекс зданий и сооружений цеха по производству красного кирпича по улице Осипенко, 21, 21/1-21-3, 21/8, 21/11-21/14 в городе Волковыске.

Начальная цена предмета аукциона – 29 базовых величин, размер задатка – 1 базовая величина.

Аукцион состоится 19 сентября 2019 года в 12.00.

2. Изолированное помещение водолечебницы, расположенное по адресу: Волковысский район, д. Теолин, ул. Молодежная, 5-2.

Начальная цена предмета аукциона – 1 базовая величина, размер задатка – 1 базовая величина.

Аукцион состоится 19 сентября 2019 года в 11.30.

Заявки на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционах – 13 сентября 2019 г. до 17.00.

Подробная информация по телефонам:

В городе Волковыске: 8 (01512) 4 50 25, 2 07 46.

В городе Гродно: 8 (0152) 77 29 15, 72 25 18, 72 21 02.

Сайты: www.region.grodno.by, gki.gov.by

УНП 500042135

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 9 сентября 2019 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены после несостоявшихся торгов по продаже объекта недвижимости – нежилого изолированного помещения, расположенного по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Пушкина, 2-11, принадлежащего Обществу с ограниченной ответственностью «Селия сервис» на праве собственности

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, руб. (в т. ч.НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Помещение общественного питания, **инв. № 350/D-230849** | Назначение: помещение общественного питания. Расположено на 4-м этаже пятиэтажного многофункционального здания, 2011 года постройки. Общая площадь помещения 449,2 кв. м. Установлен сервитут площадью 50,7 кв. м без взимания платы. **Помещение сдано в аренду сроком до 30.06.2023 г.** **Помещение находится в ипотеке у ОАО «Белгазпромбанк» в обеспечение исполнения обязательств по кредитному договору. Согласие залогодержателя на продажу имеется** | **823 000,00** | **8 230,00** |

**Земельный участок** для обслуживания здания, в котором расположено изолированное помещение, на праве аренды площадью **0,1735 га (доля 287/5000)** с кадастровым номером 340100000001003509. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, сетей и сооружений канализации, сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0068 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 6 сентября 2019 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **9 сентября 2019 г.**

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**При подаче заявления участник должен иметь:** 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе по лоту № 1 согласно извещению в газете «Звязда» от 27 августа 2019 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

